Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

№ 75 (28691)

20 КРАСАВІКА 2018 г.

ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

+TV ПРАГРАМА

Як змагацца з баршчэўнікам?

Як вёска становіцца горадам

Вышэйшая школа эканоміі

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КАЛТОВІЧ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:

«Цэнавая сітуацыя ў краіне стабільная. Працягваецца інтэнсіўная работа з прадпрыемствамі натуральных манаполій, прадпрыемствамі-дамінантамі. Сёння ў індэкс спажывецкіх цэн натуральныя манаполіі ўносяць уклад у памеры 1,04 % з 2,5 % інфляцыі, атрыманай за першы квартал. Свабодны рынак, або прадпрыемствы, якія працуюць у канкурэнтным асяроддзі, зрабілі ўклад у 1,46 %. Уключэнне ў пералік дамінантаў дае права ўстанаўліваць цэнавае рэгуляванне іх работы ў адпаведнасці з Законам «Аб цэнаўтварэнні». Свабодны рынак працуе, мы не ўмешваемся ў змяненне цэн. Тут дзейнічаюць канкурэнтныя ўмовы. Колькасць прадпрыемстваў, прапанаваная прадукцыя ствараюць сітуацыю спаборніцтва. Ні адно прадпрыемства не павышае цэны неабгрунтавана».

ISSN 1990 - 763X

Фота БелТА.

Падчас сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы з прэм'ер-міністрам Малдовы Паўлам Філіпам.

БЕЛАРУСКІЯ ТЭХНАЛОГІІ — ДЛЯ СЯБРОЎ

Засеянае поле кукурузы, планы па вырабе віна і продажах беларуска-малдаўскіх тралейбусаў у Еўрасаюз — традыцыйна багатым на вынікі і новыя задачы аказаўся візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў гэтыя дні ў Кішынёў.

Учора адбылася сустрэча кіраўніка беларускай дзяржавы і прэм'-ер-міністра Малдовы Паўла Філіпа. Бакі дамовіліся, што Беларусь дапаможа Малдове ў кадравай сферы па тэхнічных спецыяльнасцях, а таксама пабудуе побач з Кішынёвам малочнатаварны комплекс на аснове беларускіх тэхналогій. У сваю чаргу малдаўскі прэм'ер заявіў, што беларуска-малдаўскія тралейбусы плануюць пастаўляць у Еўрасаюз без мытных збораў, што таксама з'яўляецца перспектыўным кірункам супрацоўніцтва.

СТАР. 2

Фота БелТА.

ПАСАДЗІ ГАЙ...

Удзельнікі акцыі — Сяргей ШАЎЦОЎ і Іван СЫСА.

У Беларусі праходзіць Тыдзень лесу. Як паведаміў міністр лясной гаспадаркі Віталь Дрожжа, падчас яго плануецца пасадзіць 18 мільёнаў дрэў. Новыя лясы падчас акцыі мяркуецца стварыць на плошчы звыш 3,7 тысячы гектараў.
У пасадцы лясоў прымаюць удзел дэпутаты, прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, кантрольных ведамстваў, бізнесу, грамадскіх аб'яднанняў, сродкаў масавай інфармацыі. Вось і ў Грабаўскім лясніцтве Гомельскага лясгаса супрацоўнікі ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гомельскай вобласці пасадзілі гай з саджанцаў бярозы, клёна і сасны. Агульная плошча насаджэнняў склала 4,9 гектара.

■ 50+

«УСІМІ ПОСПЕХАМІ Я АБАВЯЗАНЫ ЖОНЦЫ»

86-гадовы прафесар у галіне машынабудавання на пенсію яшчэ не збіраецца...

Валерый ГУСЬКОЎ — вучоны з сусветным іменем, доктар тэхнічных навук, прафесар, з'яўляецца спецыялістам у галіне машынабудавання і тэхнікі спецыяльнага прызначэння. На сваім цяперашнім працоўным месцы — кафедры «Трактары» ў БНТУ — працуе з 1963 года.
Калі я патэлефанавала Валерыю Уладзіміравічу і падчас размовы пацікавілася, як яму ўдаецца заставацца ў такой добрай фізічнай і творчай форме, той, ні на секунду не задумаўшыся, адказаў: «Усімі поспехамі я абавязаны сваёй жонцы». Ці шмат знойдзецца мужчын, здольных вымавіць такую фразу? Мужчын, якія адбыліся і ў сваёй прафесіі, і ў сям'і? Мы сустрэліся з Валерыем Уладзіміравічам, каб пагутарыць з ім — і не столькі пра навуку, колькі пра жыццё. У тым ліку пра тое, якія ўзлёты яно нам рыхтуе і праз якія трагедыі часам змушае прайсці. Фрагменты нашай размовы — у гэтым артыкуле...

СТАР. 4

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

БЕЛАРУСКІЯ ТЭХНАЛОГІІ — ДЛЯ СЯБРОЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Дзве тысячы ліфтаў, паводле даных вашага ўрада, трэба мяняць (у Малдове — «Зв.»). Ліфты робяць у нас, прычым выйшлі з імі на касмічны ўзровень. Чаму мы не можам тут іх збіраць? Можам. Трэба аўтобусы — давайце будзем разам вырабляць», — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка.

У той жа дзень Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон наведалі інстытут раслінаводства «Парумбень», дзе агледзелі выстаўку сучаснай беларускай сельгастэхнікі, абмеркавалі з кіраўніцтвам інстытута развіццё супрацоўніцтва ў гэтай галіне, а затым на трактарах засеялі поле кукурузай. Прэзідэнт Малдовы выказаў упэўненасць, што ўраджай будзе добры. Таксама ён выказаў удзячнасць за бязвыплатна пастаўленыя ў Малдову беларускія трактары.

У сваю чаргу, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь і Малдова будуць развіваць узаемадзеянне ў селекцыі насення кукурузы і іншых сельгаскультур. «Мы бачым новыя кірункі для супрацоўніцтва, у прыватнасці гэтага цэнтра вучоных Малдовы і беларускіх вучоных, і гэта мяне радуе», — сказаў беларускі лідар.

Ігар Дадон адзначыў, што большая частка вінаробнай прадукцыі з Малдовы пастаўляецца ў Беларусь. Улічваючы высокую папулярнасць малдаўскага віна, ён паабяцаў навучыць Аляксандра Лукашэнку вырошчваць вінаград. Прэзідэнт Беларусі прыняў запрашэнне і паабяцаў наведаць родныя мясціны малдаўскага лідара, калі гэта будзе атрымлівацца па графіку.

Напрыканцы візіту Беларусь і Малдова падпісалі дакументы аб развіцці супрацоўніцтва ў такіх сферах, як энергетычная, банкаўская, судовая, ахова здароўя. Так, урад Беларусі і камерцыйны банк Moldova Agroindbank заключылі дагавор аб умовах выдачы крэдытаў для набыцця ў Малдове беларускіх тавараў. Дагавор аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве заключаны паміж акадэміямі навук дзвюх краін. Шэраг дакументаў падпісалі і кіраўнікі беларускіх і малдаўскіх рэгіёнаў.

Вераніка ПУСТАВІТ.

■ Прыярытэты

ЭПАХАЛЬНАЯ ПАДЗЕЯ ДЛЯ «ВЯЛІКАГА КАМЕНЯ»

У склад кіруючай кампаніі Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка ўвойдзе нямецкая карпарацыя.

Кампанія Duisburger Hafen AG можа стаць акцыянерам СЗАТ «Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка» ў сярэдзіне мая. Пра гэта ў праграме «Тыдзень» на тэлеканале СТБ паведаміў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалай Снапкоў.

Гаворачы аб тэрмінах уваходжання ў склад кіруючай кампаніі парка «Вялікі камень» нямецкай карпарацыі, ён заявіў, што падпісанне дакументаў і правядзенне транзакцыі па куплі акцый чакаецца ў сярэдзіне мая. «Пасяджэнне Савета акцыянераў адбылося. Гэтая здзелка была ўхвалена яшчэ раз. Лічу, што для парка яна з'яўляецца эпахальнай», — падкрэсліў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. «Мы пазіцыянуем сябе, і так яно ёсць, як сказаў Сі Цзіньпін, што парк — жамчужына «Пояса і шляху». Як бы ні было складана ва ўмовах канкурэнцыі рэалізаваць гэты тэзіс, логіка простая: Урумчы (Сіньцзян-Уйгурская аўтаномная акруга), які пазіцыянуецца як лагістычны хаб на Шаўковым шляху, а канцавы пункт — Дуйсбург», — адзначыў Мікалай Снапкоў. Паводле яго слоў, дзве траціны кантэйнерных цягнікоў з Кітая спыняюцца ў Дуйсбургу, а паміж імі — парк «Вялікі камень». Таму лагічна, што і кітайскі, і нямецкі бакі ўдзельнічаюць у праекце. Гэта сведчыць аб тым, што яны будуць зацікаўлены накіроўваць грузы ў парк, лічыць Мікалай Снапкоў.

Ул. інф

ЯК І РАНЕЙ ПА СУБОТАХ

На сувязі з насельніцтвам — Мінскі гарадскі і абласныя выканаўчыя камітэты. Гэтым разам, 21 красавіка, званкі ад юрыдычных асоб і простых грамадзян будуць прымаць намеснікі старшыняў і кіраўнікі спраў. У аблвыканкамах адзначаюць, што колькасць зваротаў апошнім часам значна знізілася. І ўсё часцей гучаць словы падзякі за ўжо вырашаныя пытанні.

Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 у суботу правядуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8-016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8-021 222 22 22;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8-023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8-015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8-022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА аблсавета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8-017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Ігар Віктаравіч ЮРКЕВІЧ. Тэл. 8-017 222 44 44.

■ Парламенцкі дзённік

У АБАРОНУ ГРАМАДСТВА І ДЗЯРЖБЯСПЕКІ

Змяненні ў Закон аб СМІ прыняты ў першым чытанні

Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на пасяджэнні чацвёртай сесіі шостага склікання разгледзелі законапраект «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Беларусі», які ў выніку быў прыняты ў першым чытанні.

Па словах **міністра інфармацыі Аляксандра КАРЛЮКЕВІЧА**, які выступіў дакладчыкам па гэтым пытанні, змены неабходны для гарманізацыі беларускага заканадаўства ў галіне масавай інфармацыі з заканадаўствам дзяржаў — удзельніц Дамовы аб стварэнні ЕАЭС, а сам законапраект накіраваны на абарону дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, нацыянальнай бяспекі нашай краіны.

Што ўключае ў сябе гэты дакумент? Акрамя пашырэння паняційнага апарату і распаўсюджвання дзеяння Закона аб СМІ на інтэрнэт-рэсурсы, сеткавыя выданні атрымаюць магчымасць ажыццяўляць дзяржаўную рэгістрацыю на добраахвотнай аснове. Калі ж сродак масавай інфармацыі не зарэгістраваны, то дзяржаўныя органы маюць права адмовіць у акрэдытацыі яго журналістам.

Яшчэ ў Законе аб СМІ ўстанаўліваюцца правы і абавязкі ўладальніка інтэрнэт-рэсурсаў, сярод якіх і ідэнтыфікацыя карыстальнікаў. Дакументам таксама абмяжоўваецца ўдзел замежных СМІ ў фарміраванні беларускай медыя-прасторы без наяўнасці дазволу. Сярод цікавых новаўвядзенняў — тэлеперадач айчыннай вытворчасці ў штотыднёвым аб'ёме вяшчання павінна быць не менш за 30 %.

Цікавасць у дэпутатаў выклікала ідэнтыфікацыя карыстальнікаў, у сувязі з чым у міністра інфармацыі спыталі, ці не пяройдуць айчынныя каментатары на іншыя пляцоўкі пры ўступленні новаўвядзенняў у сілу. Аляксандр Карлюкевіч справядліва адзначыў, што працэс ідэнтыфікацыі — гэта не навіна, яна існуе ў шматлікіх інтэрнэт-праектах і сёння. «Калі спажывец і тыя ўдзельнікі сацыяльных сетак, электроннай прасторы апрыёры не будуць выконваць заканадаўчую базу і будуць сыходзіць у нейкую іншую прастору, я не бачу нічога страшнага», — дадаў ён.

Спыніць хабарніцтва!

У кулуарах Палаты прадстаўнікоў **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ** расказаў пра сітуацыю з былым старшынёй Гомельскага райвыканкама Аляксандрам Сітніцай, які, паводле афіцыйнай інфармацыі, на мінулым тыдні быў звольнены за прагулы.

Па словах Шуневіча, былога чыноўніка затрымалі за хабар. Цяпер ён прыцягваецца да крымінальнай адказнасці і знаходзіцца ў следчым ізалятары на тэрыторыі нашай краіны. Кіраўнік МУС таксама праінфармаваў, што Сітніца хаваўся ў Расіі, аднак там быў затрыманы праваахоўнымі органамі, пасля чаго добраахвотна пакінуў суседнюю дзяржаву.

Таксама міністр расказаў пра тое, як праходзіць работа над беларуска-расійскім пагадненнем аб узаемным прызнанні віз. Ён адзначыў, што ўнутрыдзяржаўнае ўзгадненне пройдзена, аднак канкрэтныя тэрміны рашэння не назваў. Нагадаем, пагадненне аб узаемным прызнанні віз распрацоўваецца для бесперашкоднага наведвання футбольнымі аматарамі чэмпіянату свету ў Расіі.

Акрамя гэтага, Ігар Шуневіч паведаміў, што кожны супрацоўнік вонкавай службы будзе мець відэарэгістратар, МУС у тым зацікаўлены. Гэты працэс адбываецца ўжо цяпер — напрыклад, у 98 % супрацоўнікаў ДАІ яны ёсць у службовых аўтамабілях. Непасрэдны працэс закупкі ідзе пастаянна, міністэрства імкнецца мінімізаваць выдаткі і шукае тэндары, дадаў ён.

Падобная мера не толькі дапаможа ўстанавіць кантроль за дзеяннямі супрацоўнікаў праваахоўных органаў, але і дысцыплінуе грамадзян, якія ўступаюць у дыялог са службовай асобай. Такія запісы рэальна могуць дапамагчы ў вырашэнні канфліктаў і спрэчных сітуацый.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

АДПРАЎЛЕНЫ Ў АДСТАЎКУ ЎРАД КЫРГЫЗСТАНА

Прэзідэнт Кыргызскай Рэспублікі Сааранбай Жээнбекаў адправіў у адстаўку кабінет міністраў краіны на чале з прэм'ер-міністрам Сапарам Ісакавым. Пра гэта паведаміла ў чацвер прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

«Прэзідэнт адобрыў прынятае раней парламентам рашэнне аб выказванні недаверу ўраду і падпісаў указ аб адстаўцы кабінета міністраў», — заявілі ў прэс-службе.

Дэпутаты кыргызскага парламента на пасяджэнні 19 красавіка прагаласавалі за выказванне недаверу ўраду. Гэта рашэнне падтрымаў 101 дэпутат, супраць выступілі ўсяго пяць чалавек, паведамляе ТАСС. У адпаведнасці з заканадаўствам краіны, прынятае дэпутатамі рашэнне было накіравана прэзідэнту, які меў права альбо адобрыць адстаўку кабміна, альбо не пагадзіцца з парламентарыямі.

З ініцыятывай выражэння недаверу ўраду выступілі ў чацвер прадстаўнікі апазіцыйных фракцый парламента. Па іх словах, яны сабралі неабходныя для гэтага подпісы траціны дэпутатаў.

ПРАВААБАРОНЦЫ АБВІНАВАЦІЛІ ЛОНДАН У САДЗЕЙНІЧАННІ ЎДАРАМ БЕСПІЛОТНІКАЎ ЗША ПА МІРНЫМ НАСЕЛЬНІЦТВЕ

Няўрадавая арганізацыя Amnesty International абвінаваціла Вялікабрытанію ў садзейнічанні амерыканскай ваеннай праграме па выкарыстанні беспілотных лятальных апаратаў (БПЛА), у выніку якой у многіх краінах свету гіне мірнае насельніцтва. Аб гэтым паведамляецца ў прэс-рэлізе, апублікаваным учора на афіцыйным сайце праваабарончай арганізацыі.

«Чатыры базы брытанскіх ВПС у Ёркшыры, Кембрыджшыры, Лінкальншыры і Нортгемптаншыры ў значнай ступені датычныя да ўдараў дронаў ЗША, якія пацягнулі за сабой чалавечыя ахвяры, — гаворыцца ў паведамленні. — Вельмі непразрыстая ваенная праграма па выкарыстанні БПЛА ўжо прывяла да смерці сотняў мірных грамадзян».

Арганізацыя прыводзіць даныя лонданскага Бюро журналісцкіх расследаванняў, паводле падлікаў якога з 2004 года ў выніку прымянення ўдарных БПЛА ЗША ў Афганістане, Пакістане, Самалі і Емене загінула больш за 1,5 тысячы мірных жыхароў.

Amnesty International заклікае Вялікабрытанію і іншыя еўрапейскія краіны кардынальна перагледзець сваю палітыку ў сферы прадастаўлення ЗША разведданых і аператыўнай ваеннай дапамогі.

СУД АБАВЯЗАЎ ДЭВІДА КОПЕРФІЛЬДА РАСКРЫЦЬ ТАЯМНІЦУ ФОКУСА

Амерыканскі суд у штаце Невада абавязаў знакамітага ілюзіяніста Дэвіда Коперфільда раскрыць таямніцу фокуса са знікненнем групы людзей са сцэны. Пра гэта паведамляе ТАСС.

Суд займаўся разглядам справы супраць Коперфільда пасля таго, як на ілюзіяніста падаў іск грамадзянін Вялікабрытаніі Гэвін Кокс, які сцвярджае, што атрымаў моцныя траўмы падчас удзелу ў нумары са знікненнем. Адзначаецца, што таямніцу фокуса ў мэтах выканання патрабавання суда раскрыў прадзюсар шоу Коперфільда і яго блізкі сябар Крыс Кенер. Ён прадэманстраваў тэхніку выканання знакамітага трука ў гатэлі MGM Grand у Лас-Вегасе.

Як аказалася, падчас трука, калі з падвешанай клеткі на сцэне адначасова знікаюць 12 чалавек, асістэнты ілюзіяніста выводзяць удзельнікаў па праходах з цёмных штор, а затым вяртаюць іх назад. Менавіта ў ходзе такога «падарожжа» ў цемры брытанец Гэвін Кокс упаў і атрымаў траўмы, на лячэнне якіх, па яго заяве, ён патраціў ажно $400 тысяч. Таму Гэвін падаў у суд на Коперфільда і гатэль, патрабуючы выплаты кампенсацыі.

■ Ведай нашых!

Матэматыка скарылася беларускім дзяўчатам

На 7-й Еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе для дзяўчат у Італіі прадстаўніцы беларускай школы заваявалі сярэбраныя медалі.

Міжнародныя матэматычныя алімпіяды (IMO) праводзяцца ў свеце з 1959 года. Пачынаючы з 2013 года, удзел у Еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе для дзяўчат прымае і беларуская каманда. Сёлета па выніках алімпіяды беларускія ўдзельніцы сталі ўладальніцамі трох сярэбраных медалёў. У выніковай табліцы каманда Рэспублікі Беларусь заняла 10-е месца, а сярод 36 еўрапейскіх краін-удзельніц — 8-е.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Дабрачыннасць

ГРОШЫ ДЛЯ ДЗІЦЯЧАЙ БАЛЬНІЦЫ

Больш за 115 тысяч рублёў ахвяраванняў сабралі ў Бабруйску падчас дабрачыннага марафону «Па закліку сэрца ўсім светам»

Актыўны збор сродкаў на рэканструкцыю Бабруйскай дзіцячай бальніцы быў распачаты летась па ініцыятыве грамадскасці і мясцовых улад. А ў гэтую сераду дзякуючы актыўнасці знакамітага спевака Руслана Аляхно, ураджэнца Бабруйска, які пажадаў падтрымаць свой горад у Год малой радзімы, на лядовай «Бабруйск-арэне» адбыўся вялікі канцэрт з удзелам беларускіх і расійскіх зорак.

Руслана падтрымаў яшчэ адзін ураджэнец Бабруйска, таленавіты журналіст Вадзім Шчаглоў, які на базе гарадской газеты «Бабруйскае жыццё» за некалькі гадоў стварыў магутны медыяхолдынг з асабістым FM-радыё і тэлебачаннем. Зараз Вадзім Шчаглоў працуе першым намеснікам генеральнага дырэктара тэлеканала СТБ, а ў родны Бабруйск прыехаў, каб прыняць удзел у дабрачынным марафоне ў якасці вядучага канцэрта.

— Праект стартаваў летась пры падтрымцы нашага радыё «Зефір FM», — адзначыў ён. — У нас тады атрымалася сабраць для дзіцячай бальніцы больш за 170 тысяч беларускіх рублёў.

Дзіцячая бальніца ў Бабруйску абслугоўвае 46 тысяч дзяцей з горада і з навакольных раёнаў. Летась тут паправілі здароўе каля шасці тысяч маленькіх пацыентаў. Першая чарга рэканструкцыі, у выніку якой з'явілася сучаснае рэанімацыйнае аддзяленне, была зроблена яшчэ ў 2009 годзе. «Пасля адкрыцця гэтага аддзялення бабруйскія медыкі пачалі выходжваць неданошаных немаўлят і нованароджаных дзяцей з цяжкімі паталогіямі», — адзначыла **галоўны ўрач дзіцячай бальніцы Ірына РЫЖАНКОВА.**

На капітальны рамонт і тэхнічнае ўдасканаленне другой чаргі Бабруйскай дзіцячай бальніцы зараз патрэбна больш за 8 мільёнаў рублёў. Некалькі гадоў таму была распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя, але з працягам рэканструкцыі ўзніклі фінансавыя цяжкасці. Падчас дабрачыннага марафону тут пабывалі прадстаўнікі дыпламатычных місій, якія прыехалі ў Бабруйск падтрымаць праект. Яны змаглі ўбачыць усё на свае вочы, а заадно азнаёміцца з магчымасцямі рэанімацыйнай дапамогі дзецям.

Дыпламаты таксама прынялі ўдзел у аматарскім футбольным матчы. Уваход на стадыён быў бясплатны, але кожны глядач змог зрабіць свой унёсак і папоўніць агульную скарбонку. З невялікім адрывам 2:1 перамаглі бабруйчане, але стаўка рабілася не на перамогу, а на дабрачыннасць.

Да марафону далучыўся і шэраг бабруйскіх прадпрыемстваў, прадстаўнікі сярэдняга і малога бізнесу, грамадскасць, Белтэлерадыёкампанія, іншыя сродкі масавай інфармацыі. Дзякуючы канцэрту было сабрана яшчэ 115 тысяч такіх неабходных для рэканструкцыі бальніцы рублёў.

— Марафон набірае абароты. І я вельмі ўдзячны ўсім, хто адгукнуўся на нашу акцыю, — адзначыў **старшыня Бабруйскага гарвыканкама Аляксандр СТУДНЕЎ.** — Вялікі дзякуй артыстам, якія адклалі ўсе свае справы і прыехалі ў Бабруйск. Не сумняваюся, што знойдзецца яшчэ шмат неабыякавых да гэтай праблемы людзей. Тое, што мы зараз робім, называецца добрым прыкладам дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Напярэдадні падзеі

ЮБІЛЕЙНЫ МАТЧ БУДЗЕ ЦІКАВЫ

Заўтра стартуе тэнісны паядынак плэй-оф Сусветнай групы Кубка Федэрацыі паміж зборнымі Беларусі і Славакіі

Для нашай каманды гэта будзе пяты запар дамашні матч і 100-я міжнародная сустрэча ў рамках камандnага чэмпіянату свету. Пераможца пачне наступны сезон у васьмёрцы наймацнейшых зборных свету, а той, хто прайграе, апусціцца ў дывізіён ніжэй.

Каманды ўжо некалькі дзён знаходзяцца ў Мінску, тэнісісткі паспелі апрабаваць хард «Чыжоўка-Арэны», на якім пройдзе матч. Гісторыя сустрэч Беларусі і Славакіі налічвае ўсяго адзін паядынак, які адбыўся ў ліпені 2004 года ў Браціславе. 14 гадоў таму на грунтавых кортах нашы саперніцы даволі лёгка абыгралі беларусак з агульным лікам 4:0.

А наогул, упершыню тэнісісткі са Славакіі выступілі ў Кубку Федэрацыі ў 1994 годзе і з таго часу паспелі пабываць не толькі ў паўфінале, але і ўзняць над галавой галоўны трафей турніру: у фінале FedCup-2002 з лікам 3:1 яны абыгралі зборную Іспаніі.

Цяпер нашы саперніцы займаюць 11-ы радок у сусветным рэйтынгу, зборная Беларусі пасля лютаўскага пройгрышу немкам апусцілася з трэцяга на чацвёртае месца.

Адзначым, што ў Мінск каманда Славакіі прыбыла без сваіх лідараў Магдалены Рыбарыкавай (17 нумар сусветнага рэйтынга) і Дамінікі Цыбулкавай (30), таму статус першай ракеткі каманды дастаўся 19-гадовай Вікторыі Кужмавай. Для юнай спартсменкі гэта ўсяго другі паядынак за дарослую каманду. Разам з Вікторыяй у заяўку каманды капітан Мацей Ліптак уключыў Яну Чапелаву (117 нумар WTA), Ганну Караліну Шмідлаву (132), Рэбэку Шрамкаву (372).

— У лідараў нашай зборнай важкія прычыны адсутнасці. У іх ёсць пэўныя праблемы са здароўем, да таго ж дзяўчатам трэба весці падрыхтоўку да грунтавога сезона, — расказвае Мацей Ліптак. *— Вядома, рэйтынг беларускіх спартсменак нашмат лепшы, і каманда Беларусі з'яўляецца фаварытам. Але нам губляць няма чаго. Я заўсёды кажу, што рэйтынг — гэта рэйтынг, а матчы Кубка Федэрацыі — гэта зусім іншае, таму ўбачым, што будзе на корце.*

Таццяна Пучак, якая змяніла на капітанскім мосціку зборнай Беларусі Эдуарда Дуброва, уключыла ў склад Аляксандру Сасновіч (56 WTA), Арыну Сабаленку (47 WTA), Веру Лапко (111 WTA) і Лідзію Марозаву (490 WTA).

Там адсутнічае Вікторыя Азаранка, якая згуляла турніры ў Індыян-Уэлс і Маямі, а таксама заявілася на майскія грунтавыя турніры.

— Віку мы пакуль стараемся не турбаваць. Я мінімальна маю зносіны з яе трэнерам. На жаль, яе сітуацыя пакуль не вырашылася, таму нават нейкія каментарыі, лічу, даваць не вельмі карэктна. Застаецца толькі чакаць паспяховага вырашэння праблемы, — адзначыла Таццяна Пучак.

Таксама капітан дадала, што не лічыць нашу каманду безумоўным фаварытам, бо зборная Славакіі даволі няпростая.

— Усе дзяўчаты маладыя і на ўздыме. Гэта паказваюць іх вынікі за апошнія месяцы. Мы чакаем упарты матч і сур'ёзную барацьбу.

Як заўсёды сустрэча Кубка Федэрацыі будзе складацца з пяці гульняў. У суботу адбудуцца два адзіночныя паядынкі, а ў нядзелю, акрамя індывідуальных матчаў, пройдзе яшчэ і парны.

Акрамя матча ў Мінску, барацьбу за права згуляць у Сусветнай групе павядуць яшчэ тры пары камандаў: Румынія — Швейцарыя, Аўстралія — Нідэрланды, Італія — Бельгія.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ

■ Не сезон

ЗЛАВІЎ СУДАКА? АДПУСЦІ!

У рыбалоўных угоддзях краіны з 15 красавіка да 30 мая ўстанаўліваецца забарона на лоўлю судака. У выпадку ненаўмыснага вылаву рыбу неабходна адпусціць.

За незаконную лоўлю ў названы перыяд прадугледжана адміністрацыйная адказнасць — штраф ад 20 да 50 базавых велічынь, магчыма канфіскацыя прылад лоўлі. Пры гэтым за кожную асобіну судака, злоўленую падчас забароны, прыйдзецца пакрыць прычыненую шкоду па трайной таксе — 18 базавых (441 рубель). Калі агульная сума шкоды складзе больш за 100 базавых, можа быць распачата крымінальная справа, адзначылі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце. Знаходжанне ў рыбалоўных угоддзях або на прылеглай да іх тэрыторыі на адлегласці да аднаго кіламетра ад берагавой лініі з рыбай, лоўля якой у гэты час забаронена (судак), без дакументаў, якія пацвярджаюць законнасць валодання рыбай, цягне накладанне штрафу ад 5 да 30 базавых велічынь.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Ёсць нагода

СТАГОДДЗЕ З НАВІНАМІ

Менавіта 100 гадоў споўніцца БелТА сёлета 23 снежня. Учора ў Выканкаме СНД адбылося гашэнне паштовай маркі з гэтай нагоды. А таксама прайшло пасяджэнне Савета кіраўнікоў дзяржаўных інфармацыйных агенцтваў Садружнасці.

Фота БелТА

Найбуйнейшае інфармацыйнае агенцтва нашай краіны доўгі час, захоўваючы юрыдычную самастойнасць, працавала ў цеснай звязцы з ТАСС, а з 1991 года працягнула асвятляць навіны суверэннай Беларусі. Зараз на ўласным інтэрнэт-сайце размешчана інфармацыя на шасці мовах: беларускай, рускай, англійскай, нямецкай, іспанскай і кітайскай. Учора Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі выпусціла ў абарачэнне паштовы блок «100 гадоў Беларускаму тэлеграфнаму агенцтву».

Як заявіў падчас цырымоніі **намеснік міністра інфармацыі Беларусі Павел ЛЁГКІ**, мы шчыра спадзяёмся, што агенцтва не проста захавае пазіцыі вядучага інфармацыйнага рэсурсу краіны, але і значна ўмацуе іх. Жыццё не стаіць на месцы. З'яўляюцца новыя тэхналогіі, прыходзяць новыя людзі, і мы адчуваем сябе ўпэўнена ў тым сэнсе, што агенцтва ідзе за самымі сучаснымі тэндэнцыямі.

Надзея АНІСОВІЧ.

■ Жыццё сталіцы

ДЛЯ ТЫХ, КАМУ НЕ СПІЦЦА...

Восем сталічных бібліятэк запросяць наведвальнікаў на «Бібліяноч»

Сёння, 20 красавіка, у Мінску адбудзецца цікавая акцыя, удзельнікі якой падрыхтавалі арыгінальныя і разнастайныя праграмы: напрыклад, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі будуць весці гаворку аб паралелях часу, а ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі ў якасці тэмы абралі «Гісторыі перад сном»...

Як паведамляюць арганізатары, бібліяноч будзе праходзіць з 19 да 23 гадзін, выключэнне толькі для трох дзіцячых бібліятэк, дзе акцыя пачнецца а 18-й і скончыцца да 21-й гадзіны. Уваход вольны.

Так, у Нацыянальнай бібліятэцы для наведвальнікаў падрыхтавалі камандныя гульні па «настолках», сеансы адначасовай гульні ў шахматы і шашкі, цікавыя трэнінгі па тэмах адносін паміж поламі, майстар-класы па танцах і творчыя майстэрні. А яшчэ тут можна будзе перанесціся ў часы СССР і паглядзець першы беларускі фільм жахаў «Масакра».

У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі чакаюць тэматычныя кніжныя выставы, кулінарны батл, шляхецкі бал ды інтэлектуальнае даследаванне.

Цэнтральная бібліятэка імя Янкі Купалы запрашае ў «Гарадскі квартал»: тут рыхтуюць паэтычныя імпрэзы, прэзентацыі, майстар-класы і квэст «Камароўскія таямніцы».

Фундаментальная бібліятэка БГУ прапануе зрабіць вандроўку «Вакол свету за адну ноч». Чытальныя залы, абанементы, фае і нават... падвалы бібліятэкі ператворацца ў кантыненты, краіны, гарады. У «жывой бібліятэцы» наведвальнікам прапануюць прачытаць «жывыя кнігі» — гісторыі заўзятых падарожнікаў і прадстаўнікоў розных культур і нацыянальнасцяў. А таксама навучаць каліграфіі ды запросяць у падарожжа ў несвядомае.

Навуковая бібліятэка БНТУ ў якасці тэмы абрала «Мінск». Усё аб сталіцы музычнай, сучаснай, літаратурнай, інтэлектуальнай, архітэктурнай можна будзе даведацца тут. А яшчэ гасцей чакаюць пляцоўка «настолак» ды фаер-шоу на заканчэнне.

Цэнтральная дзіцячая бібліятэка імя М. Астроўскага, дзіцячая бібліятэка № 16 і № 3 імя А. Гайдара падрыхтавалі мерапрыемствы, аб'яднаныя адной тэмай — «Мільён прыгод»: маленькіх чытачоў чакаюць квэсты, выставы, прэзентацыі, тэатралізаванае чытанне казак ды шмат чаго яшчэ цікавага.

Вольга АНУФРЫЕВА

Амаль 100 кілаграмаў гашышу затрымалі беларускія пагранічнікі пад Брэстам

Варты мяжы затрымалі вялікую партыю наркотыкаў, якую спрабавалі ўвезці ў Беларусь. Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Брэсцкай пагранічнай групы Сяргей ДЗМІТРЫЕЎ**, 28-гадовы жыхар Брэсцкага раёна вяртаўся з Польшчы дадому праз пункт пропуску «Дамачава». Кіроўца выбраў «зялёны» калідор, тым самым падкрэсліўшы, што не мае тавараў, якія трэба дэкляраваць. Але падчас праходжання кантролю службовы сабака адрэагаваў на машыну, якую накіравалі ў бокс для паглыбленага надгляду.

У выніку быў знойдзены тайнік, дзе ляжала 12 прамавугольных брыкетаў з рэчывам раслiннага паходжання. Падчас экспертызы высветлілася, што гэта гашыш. Яго вага склала 92 кілаграмы. Заведзена крымінальная справа.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

НЕ БОЙСЯ РАСКАЗАЦЬ!

З 18 да 25 красавіка ў Беларусі праходзіць акцыя «Дом без гвалту»

Яе мэта — растлумачыць, што звяртацца па дапамогу ў выпадках агрэсіі з боку блізкіх не сорамна. Гвалт у сям'і — праблема не толькі ў Беларусі, а ва ўсім свеце. У нашай краіне штогод блізкія пазбаўляюць жыцця каля сотні чалавек. Ужо ў першым квартале гэтага года такім чынам пайшлі з жыцця 23 чалавекі, а каля 40 атрымалі цяжкія цялесныя пашкоджанні. Зменшыць лічбы гэтай сумнай статыстыкі імкнуцца міністэрствы ўнутраных спраў, адукацыі, працы і сацыяльнай абароны, аховы здароўя і шэраг грамадскіх арганізацый.

Згодна са статыстыкай, кожная 4-я жанчына сутыкаецца з гвалтам у сям'і. А вось пакараць агрэсара, паводле слоў намесніка **начальніка галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Алега КАРАЗЕЯ**, можна не заўсёды. Менш за палову тых, хто здзяйсняе гвалт, прыцягваюць да крымінальнай ці адміністрацыйнай адказнасці. У астатніх выпадках, згодна з заканадаўствам, участковы інспектар можа правесці толькі прафілактычную размову. Але сітуацыю ў хуткім часе плануецца змяніць. Здзейсніць гэта дапаможа новы закон «Аб папярэджанні гвалту ў сям'і», які дакладна вызначыць, каго лічыць агрэсарам у сям'і, як яго караць, як дапамагчы ахвярам і інш. У красавіку МУС завершыць распрацоўку яго канцэпцыі, затым яна будзе ўзгоднена ўсімі зацікаўленымі ведамствамі і накіравана ў Савет Міністраў. Пасля праходжання ўсіх працэдур узгаднення закон можа быць прыняты ўжо ў наступным годзе.

Больш за пяць гадоў у Беларусі працуе агульнанацыянальная гарачая лінія для ахвяр хатняга гвалту 8-801-100-8-801, дзе аказваюць у тым ліку юрыдычную і псіхалагічную дапамогу. За гэты час на яе паступіла амаль 11 тысяч тэлефанаванняў. Паводле іх аналізу, большасць ахвяр гвалту складаюць жанчыны — 94 %. І толькі 6 % — мужчыны. Праўда, апошнім часам іх колькасць расце. Як правіла, ахвярамі мужчыны становяцца ва ўзросце пасля 60 гадоў, а здзекуюцца з іх уласныя дзеці. Далёка не заўсёды агрэсар, які праяўляе гвалт, пакутуе ад алкагольнай ці іншай залежнасці — амаль палова з іх залежнасці не маюць. Нярэдка гвалт у сям'і ўчыняюць і людзі з высокім сацыяльным статусам: на рабоце і ў вачах грамадства гэта паспяховыя людзі, дома ж — зусім іншыя.

«Нярэдка гвалт у сям'і ўчыняюць і людзі з высокім сацыяльным статусам: на рабоце і ў вачах грамадства гэта паспяховыя людзі, дома ж — зусім іншыя».

Паводле слоў **старшыні праўлення Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Гендарныя перспектывы» Ірыны АЛЬХОЎКІ**, апошнім часам спецыялістаў турбуе і такая з'ява, як сталкінг, або праследаванне. На працягу доўгага часу (да трох гадоў) былы муж ці нават сужыцель, з якім перарваныя адносіны, не перапыняе кантакт з жанчынай: працягвае тэлефанаваць і прыходзіць у яе жыллё ці праследуе іншым спосабам.

Сацыяльны партрэт ахвяры хатняга гвалту застаецца нязменным на працягу апошніх гадоў: гэта жанчына ва ўзросце ад 27 да 40 гадоў, якая знаходзіцца ў шлюбе ці пастаянных адносінах і мае адно-два дзіцяці. Кожная другая з іх лічыць за лепшае не звяртацца па дапамогу ў дзяржаўныя органы, бо баіцца, што дзяцей прызнаюць маючымі патрэбу ў ахове дзяржавы.

Дзеці, дарэчы, таксама нярэдка становяцца сведкамі або ахвярамі гвалту.

— Сям'я — гэта закрытая сістэма, і дзеці часта нават не вызначаюць як гвалт тое, што там адбываецца. Гвалт, на жаль, у некаторых сем'ях лічыцца нормай выхавання, — расказвае **псіхолаг Гарадскога клінічнага дзіцячага псіхіятрычнага дыспансера Наталля ЛІСАВЕЦ**. — Для дзяцей у нас працуе свая гарачая лінія па нумары 8-801-100-16-11, дзе псіхолагі кругласутачна акажуць дапамогу і праінфармуюць, куды звяртацца. Сюды можна тэлефанаваць і ў выпадку гвалту з боку равеснікаў.

Звяртацца ахвяры гвалту могуць не толькі на гарачыя лініі, але і ў цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, пры якіх ва ўсіх рэгіёнах дзейнічае 132 крызісныя пакоі. Як паведаміла **кансультант аддзела народнасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ**, яны бясплатна, без накіравання і дакументаў выдзяляюцца жанчынам (пры неабходнасці і яе дзецям) на неабмежаваны тэрмін да ўрэгулявання канфліктнай сітуацыі.

Алена КРАВЕЦ.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: камнеподборщик ПК-6KIVIPEKRA (тип – полунавесная, привод – от ВОМ трактора, производительность – 1,8-3,6 га/час, удельный расход топлива – 10 кг/га, рабочая ширина захвата – 6 метров, рабочая скорость – 3-6 км/час, транспортная скорость – 15 км/час, масса – 4300 кг, габаритные размеры в рабочем положении: длина – 6000 мм, ширина – 6900 мм, высота – 2600 мм, объем бункера – 1,5-2,0 куб. м, размер убираемых камней – 4-30 см)

Начальная цена продажи – 28 560 р. (двадцать восемь тысяч пятьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 2 856 руб. (две тысячи восемьсот пятьдесят шесть рублей)

Продавец – Открытое акционерное общество «Щучинагропродукт», 231513, Щучинский р-н, д. Янчуки, 8-01514-411-79

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 22 мая 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 17 мая 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

«УСІМІ ПОСПЕХАМІ Я АБАВЯЗАНЫ ЖОНЦЫ»

Пра сям'ю

Я нарадзіўся ў Забайкаллі, у Іркуцку. У Мінск трапіў па размеркаванні пасля інстытута. Тыя пяць аднакурснікаў, з якімі я сюды прыехаў, потым вярнуліся на радзіму. А я — не, бо сустрэў тут сваё каханне і застаўся. Пазнаёміўся з будучай жонкай у 1955 годзе. Як цяпер памятаю: наша група маладых канструктараў сустрэлася са студэнткамі медінстытута (медычкамі — так мы іх звалі) на вечары знаёмстваў 7 лістапада. Там мы і ўбачылі адно аднаго...

Мая будучая жонка заваявала мяне сваёй жаноцкасцю, і цяпер яна засталася такой жа, нягледзячы на ўзрост і нягоды. У яе мяккі, рахманы характар. Я часам магу «выбухнуць», — яна заўсёды згладжвае вострыя вуглы. Усё жыццё мая Яўгенія прапрацавала доктарам-педыятрам, 40 гадоў лячыла дзетак. І зараз вельмі шмат клапоціцца аб праўнуку.

...У мяне шчаслівы шлюб, жонка падтрымлівала мяне заўсёды і ва ўсіх пачынаннях. Я назіраю за жыццём і бачу, што вельмі шмат разводаў зараз. Але мы — і я, і мая жонка — вельмі адказна ставіліся да нашага шлюбу, ведалі, што нам трэба выхаваць сваіх дзяцей, даць ім адукацыю. У нас былі сын і дачка. На жаль, абаіх ужо няма ў жывых... Сын скончыў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

аспірантуру і працаваў спачатку на Мінскім трактарным заводзе, потым на Мінскім аўтазаводзе. Ён быў прадстаўніком нашага МАЗа ў Паўднёвай Афрыцы і загінуў пры выкананні абавязкаў у Кейптаўне. Дачка была дацэнтам, працавала ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце, памерла два гады таму... Але ёсць унучка і ўжо 8-гадовы праўнук, жывём усе разам. Так што жыццё працягваецца...

Пра тое, як за месяц вывучыў англійскую мову

У 1967 годзе я паехаў у Англію на стажыроўку. Жонка ж засталася тут адна з дваімі дзецьмі. У Англіі я спачатку стажыраваўся, потым працаваў нейкі час там выкладчыкам.

Мне вельмі спадабаліся англічане, яны аказаліся вясёлымі, смяшлівымі, вельмі арыгінальнымі людзьмі. І вельмі прыязнымі! Я, калі туды паехаў, англійскай мовы амаль не ведаў, і да мяне на адзін месяц прымацавалі выкладчыка, які павінен быў «падцягнуць» мяне. Гэта быў адстаўны маёр, які ўсё жыццё праслужыў у Індыі. Я не ведаў англійскай, ён не ведаў ні слова па-руску... Тым не менш мове ён мяне навучыў. Мы выходзілі на вуліцу, і я павінен быў з картай падысці да паліцэйскага і спытаць, як дабрацца ў тую ці іншую частку горада. Я слухаў тлумачэнні і павінен быў потым пераказаць усё свайму выкладчыку. Той ганяў мяне да паліцэйскага не адзін раз. Толькі калі я найпадрабязнейшым чынам па-англійску здолеў растлумачыць дарогу, мы сядалі ў грамадскі транспарт і ехалі туды. Так абследавалі Лондан, хадзілі па пабах і корчмах, па тэатрах, ён пазнаёміў мяне са сваёй сям'ёй... Увогуле, за 30 дзён ён мне добра «падцягнуў» мову, і я паспяхова здаў іспыт. Потым нават сам выкладаў там — на англійскай мове, зразумела, і публікаваў свае артыкулы... Гэта было нескладана — тэхнічная мова на самай справе простая, бо змяшчае шмат формул і графікаў...

Пра работу

Я ўсё жыццё прапрацаваў, на пенсіі не быў ні аднаго месяца. Стаж — з 1948 года, ужо 60 гадоў! Пакуль яшчэ на пенсію не збіраюся. Я прывык шмат працаваць. Раней у выхадныя дні, бывае, месца сабе не знаходзіў — нават трохі баяўся вольнага часу... Цяпер, праўда, ратуе садоўніцтва. У мяне на лецішчы ў Крыжоўцы выдатны сад: яблыні, грушы, айва, шаўкоўніца. Вельмі яго люблю.

Я шмат гадоў загадваў кафедрай «Трактары» ў БНТУ: у 1973 годзе быў абраны на гэтую пасаду і застаўся на ёй да 1990 года. Цяпер з'яўляюся прафесарам кафедры. Летась мяне пераабралі на пасаду прафесара яшчэ на пяць гадоў, а пасля гэтага ўніверсітэт падоўжыў працоўны кантракт на два гады. Так што яшчэ папрацую.

Пра студэнтаў

Набіраецца група ў 20 чалавек, але да канца навучання застаецца ўсяго 12—13. Астатнія адсейваюцца: каго адлічваюць, хто сыходзіць сам, таму што цяжка пражыць на стыпендыю і трэба ісці працаваць, хтосьці пераходзіць на завочнае навучанне... З гэтых 12—13 студэнтаў я выбіраю двух-трох самых моцных, і, акрамя чытання лекцый, працую з імі індывідуальна. Сёлета двое маіх студэнтаў сталі лаўрэатамі прэміі ў навукова-даследчай рабоце і неўзабаве паедуць у Пецярбург прымаць удзел у міжнароднай навуковай канферэнцыі.

Нядаўна ва ўніверсітэце адкрылі новую спецыяльнасць — дызайн калёсных і гусенічных машын. Туды ў асноўным дзяўчаты ідуць. А ўвогуле ў нас пераважаюць, вядома ж, хлопцы. Хоць, бывае, сустракаюцца і дзяўчаткі, якія захапляюцца тэхнікай і паступаюць сюды. І потым паспяхова працуюць інжынерамі-канструктарамі...

Пра тое, як падтрымліваць форму

Раней я на работу заўсёды хадзіў пешшу, добра, што дом не так далёка, але апошнім часам ужо дабіраюся тралейбусам. Падымаюся ўсё жыццё рана, а 6-й гадзіне, нават у выхадныя, і адразу намячаю план работы на дзень. Кожную раніцу раблю зарадку. Комплекс практыкаванняў адпрацаваны шмат гадоў таму... З тым, што ў мяне сядзячая работа, не згодны: я чытаю лекцыі студэнтам, на выкладчыцкай рабоце не пасядзіш...

Пра свой дэвіз

Ён просты: нішто чалавечае нам не чужое...

Святлана БУСЬКО.

НАША ДАВЕДКА

Валерый Гуськоў скончыў Томскі політэхнічны інстытут, аспірантуру пры Інстытуце механізацыі сельскай гаспадаркі Акадэміі навук СССР, праходзіў навуковую стажыроўку ва ўніверсітэтах Ньюкасла, Рэдынга (Вялікабрытанія).

Навуковыя інтарэсы: тэорыя, разлік, канструяванне і выпрабаванні мабільных машын. Працаваў інжынерам-канструктарам, старшым інжынерам-канструктарам, затым начальнікам канструктарскага бюро на Мінскім трактарным заводзе. Быў старшым навуковым супрацоўнікам Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі Нечарназёмнай зоны СССР у Мінску. З 1963 года працуе ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце на аўтатрактарным факультэце. За гады працы ў БНТУ падрыхтаваў больш за тысячу інжынераў-канструктараў.

Мае званне «Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР», лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

НЕЧАКАНАЯ СУСТРЭЧА

Родны брат майго дзеда Мікалай Ніканоравіч Мішчук жыў, дзякуй богу, і доўга, і плённа, у свой час — паваяваў, шмат чаго расказваў.

Значыць, студзень 1945-га. Цяжкія баі ў раёне польскага горада Лодзь. Стралковаму ўзводу трэба як найхутчэй дабрацца да перадавой. «Іншага выйсця няма, — сказаў камандзір узвода, — будзем звяртацца да мясцовых людзей, прасіць коней».

Для гэтага ў недалёкае мястэчка накіроўваюць двух байцоў, у тым ліку — радавога Мішчука, строга папярэджваюць, каб, нягледзячы на ўмовы ваеннага часу, усё было законна. А далей — са слоў дзеда:

— У крайнія хаты я не пайшоў — не выклікалі яны даверу, — успамінаў ён. — Выбраў сялібу трохі наводшыбе, з гаспадарчымі пабудовамі. Перад хатай там яшчэ сад быў. Значыць, ёсць і сапраўдны гаспадар?.. Так што пакінуў я на варце свайго напарніка, а сам падаўся ўглыб сядзібы. Зброю трымаў напагатове, бо ці мала што... Кожны шоргат чуў. І раптам — не паспеў да ганка дайсці — голас над вухам: «Мішчук?! Халера ясна... То ты?!»

Стрэлу, як расказваў дзядуля, ён спалохаўся б менш, чым уласнага прозвішча. Адкуль яно «ўзялося»?

Ды проста гаспадаром сядзібы аказаўся аднапалчанін, з якім Мікалай Ніканоравіч служыў тэрміновую службу ў Войску Польскім яшчэ на пачатку 30-х, паколькі Заходняя Беларусь знаходзілася тады ў межах Польшчы.

Радасць ад сустрэчы была невыказнай! Але ж байцам час быў выконваць баявое заданне.

Польскі таварыш ім, вядома ж, дапамог — даў пару коней, запрэжаных у доўгі воз, а ў якасці вазніцы ды праважатага — яшчэ і сына-падлетка. Сказаў на развітанне: «Хлопец — пад тваю адказнасць, Мікола... А на зваротным шляху глядзі — хаты маёй не мінай. Ведаеш цяпер, дзе жыву... Я чакаць буду».

Аднак гэтай, чаканай, сустрэчы, на жаль, не адбылося. Праз пару тыдняў у баях за Познань кулямётчык Мікалай Ніканоравіч Мішчук быў цяжка паранены. Чатыры асколкі ад мінамётнай міны ён пранасіў у правым плячы ўсё сваё астатняе жыццё. А пражыў, дзякуй богу, 92 гады і выгадаваў з жонкай васьмярых дзяцей.

Генадзь Мішчук,

в. Вотчына, Маларыцкі раён.

«ДЗЯРЭЦЬ? ХАЙ ДЗЯРЭЦЬ!»

Нічога ў тым дзіўнага: адзін мужык у прымы прыйшоў. І жыў там ціха, спакойна, ва ўсім патураў сваёй жонцы. Гэта значыць, тупаў па гаспадарцы, даглядаў скаціну, вялікі сад, агарод. Можа, так і памёр бы — не ўвайшоў у гісторыю, калі б не здарыўся з ім адзін цікавы выпадак.

Аднойчы летнім надвячоркам сядзеў ён на кухні каля прачыненага акна — разам з жонкай вячэралі.

— Дзядзька, а дзядзька, там, за токам, каршун вашу курыцу дзярэць! — пачулася раптам з вуліцы.

— Ну, і што ж ты сядзіш?! — тут жа ўспыхнула жонка. — Ляці хутчэй! А то, бач, каршун курыцу дзярэць, а табе хоць бы хны...

Апошніх слоў прымака ўжо не чуў. Ён борздзенька падхапіўся з лаўкі, выскачыў на дварышча, падабраў на хаду даўгаватую палку і подбегам панёсся за ток ратаваць нясушку.

— Кыш! Кыш! Я табе пакажу! — абяцаў каршуну прымака, абмінаючы ток і ўсё глыбей заходзячы ў сад, месцамі зарослы маліннікам, аж пакуль...

Чарговы раз адхінуўшы зараслі, ён спыніўся нібы здранцвелы: за некалькі метраў, на невялікай прагалінцы, двое, мужчына і жанчына (пра іншае тады не чуваць было) займаліся... любошчамі. Па тэлевізары ды ў кіно нічога падобнага тады не паказвалі, у кніжках пра гэта прымака не чытаў, а таму начыста забыўся і пра курыцу, і пра каршуна, і пра ўсё на свеце... Яму нават голас быў — жаночы: маўляў, пастой, мужык, пачакай, будзе і табе...

У адказ на гэтыя словы прымакова сэрца ўзрушана забілася, магутная хваля крыві ўдарыла ў скроні, юр закружыў галаву. Здалося, што гэтая маладзіца вось-вось апынецца ў ягоных абдымках, вырве з абрыдлай будзённасці. Ды...

З нябёс на зямлю яго вярнула звычайнае:

— Мікола! Мікола! Ты дзе? — крычала жонка. — Ідзі дамоў!

Што яму заставалася?

Асцярожна пераступіў з нагі на нагу, захінуў маліннік і ціха паплёўся дахаты.

— Ну што, быў каршун? — сустрэўшы яго на дварэ, папыталася гаспадыня.

— Быў.

— Прагнаў?

— Не, не прагнаў.

— Як не прагнаў?! Ён што — так і дзярэць?!

— Дзярэць!

— Мне самой яго ісці праганяць?!

— Не, не трэба. Дзярэць — хай дзярэць! — махнуў рукою прымака і пайшоў даядаць вячэру.

Ігар Пракаповіч,

г. Пастравы.

НЯНЬКА І ЛЯЛЬКІ

Мае меншыя сястрычкі з'явіліся на свет у сярэдзіне мінулага стагоддзя. Зіма ў той год выдалася рэдкая — не столькі марозная, колькі вельмі снежная. Факт, што ў лютаўскі позні вечар дабрацца да дактароў немагчыма было: толькі да Сымоніхі — бабкі-павітухі.

Яна, маленькая, згорбленая, жыла ў іншым канцы вёскі і сама тыя гурбы ніяк бы не адолела, таму бацька прынёс яе на руках. Паспеў галоўнае: прыняла павітуха адно дзіцятка, сказала, што будзе другое. І сапраўды, на свет з'явілася яшчэ адна дзяўчынка, праўда, было гэта пасля дванаццатай ночы. Таму днём нараджэння адной тата запісаў 8 лютага, а другой — 9-га. Вось такія атрымаліся сёстры-двайняты — першыя на ўсю ваколіцу.

Па вечарах мама з бабуляй Франяй купалі маленькіх, клалі іх у ложачак, які бацька сам зрабіў для сястрычак, гушкалі, спявалі калыханку, абавязкова цалавалі.

Я за ўсім назірала, усё запамінала і аднойчы, як толькі дарослыя выйшлі з пакоя, таксама захацела пацалаваць сястрычак — учапілася рукамі за край люлькі, пацягнулася да тварыка і...

Ложак — ножкамі дагары, сястрычкі, іх падушкі-коўдрачкі — усё гэта з крыкам на мяне... І «накрыла».

Во дзе жаху было! Шчасце яшчэ — што без наступстваў...

Але ж хутка прамінуў год, пайшоў другі. Маме трэба было гаспадарку глядзець. Тата дапамагаў людзям хаты будаваць. Мы з бабай Франяй заставаліся за нянек. Я ўжо навучылася супакойваць малых, забаўляць, расказваць казкі, гартаць перад імі кніжкі.

Сярод іх былі такія цікавыя...

У той дзень сястрычкі паелі кашы, папілі малачка, што стаяла ў шафцы, паглядзелі, што там яшчэ ёсць. Дасталі макарону (гэта я потым убачыла, калі кніжку закрыла), рассыпалі па падлозе фасолю. Адна з сястрычак знайшла бутэлечку. Выцягнула з рыльца газетны корак, пакаштавала, што там, перадала сястрычцы. Тая таксама прылажылася. Абедзве расчырванеліся і чамусьці адразу паснулі.

— Ну як вы? — спытала бабуля, вярнуўшыся ў хату.

— Добра, — пахвалілася я. — Дзяўчаткі спяць.

— Нешта ж рана?

А тут і мама ў хату — дожджык набег, прагнаў з гарода.

— Дзе малыя? — пытаецца ў мяне.

— Спяць, — кажу.

Мама носам павяла — і да іх.

Высветлілася, што ў бутэлечцы быў... самагон, які застаўся ад апошніх кампрэсаў.

Мама з бабуляй тут жа сталі будзіць сястрычак, паіць іх свянцонай вадзіцай, чытаць малітвы, каб яны хаця ачунялі.

...Няма ўжо на гэтым свеце ні бабулі нашай, ні бацькоў, але сёстры, калі збіраемся разам, часам просяць:

— Ну, раскажы, як ты нас няньчыла, чым паіла?

Што рабіць — расказваю. І не толькі гэта.

Лілія Скіндзер,

г. Івацэвічы.

ВЯСЕЛЬНЫ ПАДАРУНАК ДЛЯ ЖОНКІ

...Іншага чалавека хлебам не кармі — пусці на рыбу, а потым дай расказаць (ды яшчэ і паказаць), што ён злавіў, колькі штук і якіх памераў.

Рыбнагляд на гэта глядзеў інакш. Некалі, помню, застукаюць чалавека на месцы злачынства — дваццацьпятку штрафу дадуць...

(Дарэчы, іх, тыя штрафы, у райвыканкаме плацілі — кожны чацвер. Ён так і называўся — «рыбны дзень», як у сталоўках. Пад дзвярыма пэўнага кабінета і чарга такая ж збіралася. Людзі аддавалі грошы, але не сказаць, каб дужа іх шкадавалі, бо ведалі, што на Дняпро яшчэ раз сплаваюць, рыбы наловяць і штраф той «адаб'юць», што называецца, — асабліва калі ў рыбінспекцыі ёсць свой чалавек, які дапаможа за пляшку-другую «выкупіць» сеці, пакуль іх не спалілі.)

Прыкладна такой была карціна ўвогуле. А зараз — яна ж у прыватнасці.

Значыць, гадоў 35 таму ў нас хлопец адзін жаніўся — заядлы рыбак. А ў іх жа, такіх, — вайна вайной (у сэнсе вяселле вяселлем), а на рэчку згойсаць — гэта святое. І сетку паставіць таксама.

Вось жаніх (дакладней — амаль суткі як муж) і сабраўся ўжо. Яго законная жонка стала ў кампанію прасіцца. Галоўнае — ён абяцаў яе ўзяць на рыбалку, як толькі ажэняцца.

Так што адступаць чалавеку не было куды: пабеглі маладыя на раку, селі там у лодку-абшыванку, выплылі на сярэдзіну: муж стаў страўліваць сетку.

Але ж нездарма кажуць, што жанчына на караблі — дабра не чакай... На лодцы, відаць, таксама: з-пад вады, як той Піліп з канапель, «вынырнуў» рыбнагляд, сказаў, нібыта ў казцы: «Імем тарабарскага каралеўства вы... затрыманы».

А далей...

Парушальнікаў «пад канвоем» праводзяць да берага — пратакол пачынаюць складаць. Як прозвішча, пытаюць, дзе жывеш? Хлопец гаворыць ім. Але ж трэба высветліць, ці праўду?

Інспектары да рыбакоў, што лавілі рыбу вудамі. Тыя ў адказ: «Мы гэтую пару не ведаем... Мы не тутэйшыя...» (А самі — з той жа вуліцы... За адным сталом учора сядзелі!)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

20 красавіка 2018 г. № 16 (449)

стар. 3

Што можа дэпутат?

стар. 14

Не чужая бяда

стар. 15

Вяскоўцы сталі гараджанамі

ТЭМА ТЫДНЯ

ДАЦЬ АДПОР «АГРЭСАРУ»

ЦІ ПЕРАМОЖНЫ БАРШЧЭЎНІК САСНОЎСКАГА?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У СЯРЭДЗІНЕ мінулага стагоддзя, калі баршчэўнік Сасноўскага завозілі ў краіну ў якасці кармавой культуры, ніхто нават не здагадваўся, што гэтая чужародная расліна, вырваўшыся на свабоду са спецыяльных плантацый, пяройдзе ў наступленне, будзе падаўляць усе іншыя культуры і ператворыцца ў самае сапраўднае экалагічнае бедства. Дзякуючы сваёй уласцівасці выдзяляць атрутны сок, баршчэўнік пагражае не толькі экасістэмам, але і здароўю людзей. Карацей кажучы, расліна, якая яшчэ гадоў 40 таму была рэдкай, стала самым небяспечным інвазійным (заносным) відам для экасістэм шэрагу краін. У пачатку XXI стагоддзя Беларусь таксама мусіла ўступіць у самую сапраўдную вайну з ім...

стар. 4,13

КАМПЕТЭНТНА

ЗЯМЛЯ ПАВІННА ПРАЦАВАЦЬ

За апошнія пяць гадоў з карты Гомельшчыны афіцыйна знік 31 населены пункт. З Чарнобылем гэта ніяк не звязана. Проста памерлі апошнія людзі, якія жылі ў маленькіх вёсачках, і іх назвы цалкам адышлі ў гісторыю. А землі, на якіх вырошчвалася бульба і спелі яблыкі, былі перададзены сельгаспрадпрыемствам ці ў дзяржаўны лясны фонд. Начальнік земляўпарадкавальнай службы Гомельскага аблвыканкама Аляксандр МАТАРАС гаворыць, што зніклыя вёсачкі размяшчаліся па ўсёй вобласці:

— На жаль, ёсць населеныя пункты, якія не маюць перспектывы. На жыллё там няма попыту, жыхароў становіцца ўсё менш і паступова ажыццяўляецца знос старых і пустуючых дамоў. З імі і з землямі, на якіх знаходзяцца гэтыя збудаванні, ідзе пастаянная работа. Мы дакладна ведаем, чаго хочам, калі пачынаем працаваць з канкрэтным домам. У першую чаргу выяўляем, ці магчыма пасля зносу выкарыстоўваць участак у сельскай гаспадарцы. Бо гэта — самы эфектыўны спосаб і гарантыя таго, што заўтра зямля не ператворыцца ў звалку ці не зарасце кустоўем. Таму, калі мы працуем па пэўных населеных пунктах, у першую чаргу звяртаем увагу на тыя трухлявыя дамы, якія прымыкаюць да сельскагаспадарчых угоддзяў.

— А што робіце з непрыдатнымі пабудовамі, калі яны акружаны жылымі і добраўпарадкаванымі дамамі?

— Участкі ў цэнтры населеных пунктаў больш праблемныя, чым на ўскраіне. Тым больш у насельніцтва рознае стаўленне да такіх зямель. Адны з задавальненнем успрымаюць пасадку на іх дрэў і стварэнне міні-паркаў, а іншыя катэгарычна супраць і гавораць: «Мы не хочам жыць у лесе». Недзе ўсталёўваюць малыя архітэктурныя формы, разбіваюць кветнікі... Але ж гэта ў большых населеных пунктах, накшталт аграгарадкоў ці райцэнтраў, дзе таксама ёсць старыя дамы. Мы не супраць, каб людзі бралі і апрацоўвалі дадатковыя ўчасткі, але ж часцей за ўсё ім дастаткова і той зямлі, што ёсць. Між тым нават толькі абкошванне такіх участкаў — гэта дадатковыя фінансавыя затраты для мясцовых улад.

— На Гомельшчыне каля 55 % тэрыторыі занята лясамі. Іх колькасць павялічваецца і за кошт зямель, якія некалі былі заселены?

— Калі для сельскай гаспадаркі землі не могуць быць выкарыстаны, значыць, мы павінны аддаць іх у дзяржаўны лясны фонд, каб там быў высаджаны лес і ў далейшым раслі лясныя культуры. Сёлета мы паставілі задачу перадаць у дзяржаўны лясны фонд усе землі, якія выявілі ў папярэднія гады. Па нашых ацэнках, гэта каля 14 тысяч га. Пераважна гэта землі з нізкай бальнасцю, якія знаходзяцца каля лесу.

— Аляксандр Васілевіч, але ж ёсць землі, якія належаць сельгаспрадпрыемствам, але таксама зарастаюць кустоўем...

— На гэта ўплываюць пэўныя прыродныя фактары. Калі, напрыклад, пару гадоў запар поле было пераўвільготненым, тэхніка на яго не магла заехаць, там усё хутка зарастае. Мы зафіксавалі на сённяшні дзень каля 5 тысяч га, якія зараслі кустоўем там, дзе гэтага не павінна быць. Займаемся тым, каб дабіцца выдалення кустоўя, каб гэтыя землі пачалі прыносіць эканамічны вынік. Летась каля 3 тысяч га мы дадалі ў сельскагаспадарчы абарот.

стар. 2

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Пачынаем са сталіцы

Сенатары ўзялі ўдзел у акцыі

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна ШЧОТКІНА прыняла ўдзел у экалагічнай акцыі «Уладкуем малую радзіму!». Удзельнікі акцыі наводзілі парадак на тэрыторыі помніка прыроды рэспубліканскага значэння «Парк камянёў» у мінскім мікрараёне Уручча. Акцыя прымеркавана да Года малой радзімы.

«Сёння кампанія «Уладкуем малую радзіму!» стартавала ў Мінску. Напэўна, гэта правільна, бо сталіца — сэрца краіны і менавіта тут прымаюцца вялікія стратэгічныя рашэнні. З Мінска кампанія распаўсюдзіцца ва ўсе куткі Беларусі, і кожны чалавек павінен прыняць у ёй удзел. Каб жыць у прыгожай краіне, трэба прыкласці для гэтага намаганні. Цяпер па ўсёй Беларусі ідуць суботнікі, і абавязкова трэба навесці парадак на сваёй малой радзіме і там, дзе жывеш», — адзначыла Мар'яна Шчоткіна.

У акцыі таксама ўдзельнічалі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў і член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Кацярына Дулава.

Форум ужо хутка

Адну з секцый сёлетняга Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі прысвецяць лічбавай эканоміцы

У Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіміра ПАНЦЮХОВА прайшло пасяджэнне рабочай групы па падрыхтоўцы і правядзенні секцыі «Лічбавая эканоміка: супрацоўніцтва рэгіёнаў, стан і перспектывы» ў рамках V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

У ходзе пасяджэння быў зацверджаны план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні секцыі, абмеркавана яе канцэпцыя, вызначана магчымае кола ўдзельнікаў, асноўных дакладчыкаў, тэмы іх выступленняў, разгледжаны іншыя арганізацыйныя пытанні.

Плануецца, што секцыя будзе праходзіць у Магілёве з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства сувязі і масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі, Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства эканамічнага развіцця Расійскай Федэрацыі, прадстаўнікоў Парка высокіх тэхналогій (Рэспубліка Беларусь) і аўтаномнай некамерцыйнай арганізацыі «Лічбавая эканоміка» (Расійская Федэрацыя), абласцей Рэспублікі Беларусь і суб'ектаў Расійскай Федэрацыі і інш.

Падчас работы секцыі будуць абмяркоўвацца, у прыватнасці, пытанні рэалізацыі дзяржаўных праграм па развіцці лічбавай эканомікі, распрацоўкі дарожнай карты па сумесных дзеяннях расійскага і беларускага бакоў у мэтах выпрацоўкі агульных падыходаў да развіцця лічбавай эканомікі на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы.

Ідэі для Садружнасці — ад маладых

Адбылося пасяджэнне Савета па справах моладзі СНД

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА прыняла ўдзел у пасяджэнні Савета па справах моладзі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Падчас пасяджэння былі разгледжаны эфектыўныя формы і метады рэалізацыі маладзёжнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь, ход выканання Плана мерапрыемстваў на 2018—2020 гады па рэалізацыі Стратэгіі міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД да 2020 года.

У гэты ж дзень парламентарый наведала міжнародную выстаўку праектаў-пераможцаў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў «100 ідэй для СНД», выстаўку рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» і ўручыла ўзнагароды аўтарам найлепшых праектаў.

Вераніка ПУСТАВІТ.

ЗЯМЛЯ ПАВІННА ПРАЦАВАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Паступова вяртаюцца ў землекарыстанне і так званыя чарнобыльскія землі...

— Пасля аварыі на ЧАЭС каля 202 тысяч га сельскагаспадарчых зямель былі выведзены з гаспадарчага абароту па прычыне забруджанасці. Цяпер карціна мяняецца. Мы імкнёмся памяншаць гэтую колькасць зямель, бо навукова даказана, што іх можна выкарыстоўваць, — падкантрольна, пры выкананні шэрагу ўмоў. У кожным раёне ёсць забруджаныя землі, пакрысе вяртаем іх у сельскагаспадарчы абарот. На выхадзе ўся прадукцыя кантралюецца і адпавядае нарматывам.

— Ці ёсць праблемныя пытанні, якія неабходна было б урэгуляваць на ўзроўні заканадаўства?

— Гэтыя праблемы ёсць, і яны вырашаюцца. Цяпер рыхтуецца праект змяненняў ва Указ Прэзідэнта № 100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці». Павінна быць крыху спрошчана працэдура ўцягнення ў абарот гэтых аб'ектаў. У мэтах гарантавання права на ўласнасць яна была даволі складанай, але практыка паказала, што такія меры не былі апраўданымі і зараз трэба ісці па шляху спрашчэння. Праблем, звязаных з уціскам інтарэсаў грамадзян, практычна не ўзнікае, а папер — дзясяткі.

— Вашы спецыялісты шчыльна займаюцца кантролем за землекарыстаннем?

— Так. Самая асноўная праблема: у нас пакуль не атрымліваецца выйсці на той узровень культуры землекарыстання, які забяспечыў бы поўны парадак. На жаль, землекарыстальнікам трэба пастаянна нагадваць пра тое, што ўчастак павінен быць добраўпарадкаваны. Мы штогод выдаём каля 30 тысяч прадпісанняў па фактах, звязаных з нядбайным стаўленнем да зямлі. Патрабаванне адно: добраўпарадкоўваць і эфектыўна выкарыстоўваць. Калі вы атрымалі права на зямельны ўчастак, трэба памятаць і пра абавязкі. Той кавалак зямлі, які вам дастаўся, трэба любіць.

Вёска Асінаўка да і пасля добраўпарадкавання.

— Якім можа быць пакаранне нядбайнага гаспадара?

— Можа быць накладзены штраф да 20 базавых велічынь. Ці ўрэшце нават можа быць адабраны зямельны ўчастак. Летась 108 зямельных участкаў былі адабраны ў тых, хто імі не займаўся як трэба. Згодна з правіламі, чалавека папярэджваюць: патрабуюць, каб ён навёў парадак. Калі не зразумеў, зноў папярэджваюць, а далей запускаецца працэдура, пры якой участак можа быць вернуты дзяржаве. А потым ён пераразмяркоўваецца — дастаецца тым, хто мае ў ім сапраўдную патрэбу. Пераважна размова ідзе пра зямельныя ўчасткі для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва. У кожным раёне Гомельшчыны ёсць такая праблема.

— Мне заўсёды цікава, пра што людзі думаюць, калі бяруць зямельныя ўчасткі «на ўсялякі выпадак»?

— Сапраўды, калі раптам ёсць магчымасць атрымаць зямлю, лічаць: «А давай возьмем, няхай будзе, а потым разбяромся». Нашы людзі часта жывуць спадзяваннем, што заўтра ім зямля можа спатрэбіцца. Таму мы пастаянна тлумачым: вы толькі патраціце час

і грошы на афармленне дакументаў. Калі адчуваеце, што не будзеце будаваць, — лепш не пачынайце. Ёсць тыя, хто спыняецца, а ёсць і тыя, хто ўсё роўна бярэ ўчасткі. У выніку мы бачым пустуючую зямлю, якая не прыносіць карысці.

> На жаль, землекарыстальнікам трэба пастаянна нагадваць пра тое, што ўчастак павінен быць добраўпарадкаваны. Мы штогод выдаём каля 30 тысяч прадпісанняў.

— Аляксандр Васільевіч, а сваіх супрацоўнікаў вы неяк зацікаўліваеце быць прыкладам для іншых?

— З гэтай мэтай мы сёлета, у Год малой радзімы, абвясцілі конкурс менавіта сярод супрацоўнікаў усіх падраздзяленняў службы землеўпарадкавання Гомельскай вобласці. Яны павінны паказаць, як добраўпарадкаваны іх асабісты дом ці дача, і прадставіць фотапрэзентацыю. Мы вывучым матэрыялы, абяром самыя лепшыя і выбарачна выедзем на месца. Вельмі важна, каб максімальная колькасць нашых супрацоўнікаў, а іх у нас больш за сотню, прадэманстравалі, як наводзяць парадак на сваёй зямлі, і тым самым падалі іншым грамадзянам прыклад. У канцы мая падвядзём вынікі, і найлепшыя будуць абавязкова ўзнагароджаны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПРА ГЭТА ПІСАЛА «МС»

СЕЛЬГАСПРАДПРЫЕМСТВУ ВЯРНУЛІ ВОРНЫЯ ЗЕМЛІ

У Гомельскай вобласці падчас кантрольных мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі сельскагаспадарчаму прадпрыемству былі вернуты ворныя землі, занятыя несанкцыянаванай звалкай.

Яе дзяржаўныя інспектары Гомельскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя выявілі каля малочнатаварнай фермы рэспубліканскага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Эксперыментальная база «Крынічная» (населены пункт Балажэвічы Мазырскага раёна). На звалцы размяшчаліся адходы вытворчасці, у тым ліку другасныя матэрыяльныя рэсурсы (поліэтылен, пластмаса і інш.).

Было ўстаноўлена, што ўсё гэта ўтварылася на ворных землях у выніку гаспадарчай дзейнасці згаданага прадпрыемства. Спецыялісты абласнога камітэта рэкамендавалі яго кіраўніку цягам трох дзён навесці парадак на ўчастку, ліквідаваўшы несанкцыянаваную звалку. Аднак праз адведзены тэрмін належныя меры не былі прыняты.

Толькі своечасовае ўмяшанне Гомельскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя дазволіла не дапусціць далейшага забруджвання зямель. У выніку ў дачыненні да РСУП «Эксперыментальная база «Крынічная» было ўстаноўлена патрабаванне аб адабранні адходаў, іх падзеле па відах, выбарцы другасных матэрыяльных рэсурсаў, накіраванні ўсяго названага ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку на аб'екты па выкарыстанні і захаванні адходаў. У дачыненні да сельскагаспадарчага прадпрыемства як вінаватай юрыдычнай асобы быў распачаты адміністрацыйны працэс.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК:

«Задача дэпутата — абазначыць праблему і прапанаваць шляхі яе вырашэння»

ШТО чакаць ад народнага абранніка, як арганізаваць работу з насельніцтвам, чаму важна ведаць «свайго» дэпутата ў твар — усё гэта ў размове са старшынёй Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

У дэпутацкай справе Дзмітрый Харытончык чалавек не новы. Працаваў у складзе Жодзінскага гарсавета, узначальваў Пастаянную камісію па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Сёлета ён заняў вельмі адказны пост старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання. Да гэтага займаў пасаду намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама. «У маёй новай рабоце ёсць свае асаблівасці, — кажа дэпутат. — Раней я курыраваў пытанні прамысловасці, менш удзяляў увагі сельскім раёнам. Зараз актыўна наведваю сельсаветы, знаёмлюся бліжэй з сельскімі дэпутатамі, вывучаю стан матэрыяльна-тэхнічнай базы ў раёнах. Усё гэта трэба для таго, каб наш дэпутацкі корпус змог працаваць з максімальнай аддачай». Графік новага кіраўніка аблсавета распісаны па хвілінах, але ў ім знайшлося месца для размовы з карэспандэнтам «МС». Дзмітрый Харытончык прызнаўся, што вельмі зацікаўлены ў адкрытым дыялогу і шчыра дзяліўся сваімі планамі і меркаваннямі.

> Людзі не прывыклі цесна працаваць з дэпутатамі. Вядома, што тут ёсць віна і саміх дэпутатаў. Трэба часцей сустракацца з выбаршчыкамі.

Праверка на месцах

— Дзмітрый Іванавіч, як вы бачыце сваю работу на новым месцы, якія задачы ставіце перад сабой і іншымі дэпутатамі ў ролі старшыні аблсавета?

— Па-першае, збіраюся выбудаваць сістэмную работу з сельскімі Саветамі, райсаветамі, органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. На месцы людзям заўсёды больш бачныя праблемы іх населенага пункта. Чаму гэта так важна? Калі абласны Савет дэпутатаў зацвярджае бюджэт, неабходна, каб сродкі накіроўваліся менавіта ў тыя сферы, якія найбольш хвалююць, патрабуюць тэрміновага вырашэння. Улічваючы, што фінансы заўсёды абмежаваныя, вельмі важна, каб зваротная сувязь з выбаршчыкамі была максімальна актыўнай. Каб дэпутацкія структуры існавалі не толькі на паперы, а каб працавалі, акумулявалі агульныя праблемныя пытанні і падымалі іх на

ўзроўні раёна, вобласці, а калі трэба — і краіны. Гэта работа вялася і раней, шмат чаго зроблена, і трэба, каб яна не прыпынілася, а наадварот — набірала тэмп.

— З моманту прызначэння на гэтую пасаду вы актыўна наведваеце аддаленыя раёны. Як вам першыя ўражанні ад работы сельскіх і раённых дэпутатаў?

— Нельга сказаць, што ўсе працуюць роўна і аднолькава. Але шмат чаго залежыць не толькі ад кадравага складу і кіраўніка выканаўчай улады. Трэба ўлічваць і фінансавы стан арганізацый, якія працуюць на тэрыторыі таго ці іншага сельсавета. Гэта асноўныя памочнікі старшыні. Калі базавая арганізацыя мае фінансавыя праблемы, мясцовай уладзе таксама будзе складана вырашаць пэўныя пытанні. Бо сваёй тэхнікі ў сельскага Савета няма.

— Што кардынальна трэба было б змяніць у дэпутацкай рабоце?

— Кардынальна мяняць нічога не трэба, а вось для паляпшэння работы неабходна ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу сельскіх Саветаў, павінны быць інструменты для правядзення добраўпарадкавання. Гэта складана, бо існуе абмежаванае фінансаванне. Магчыма, трэба падумаць над стварэннем якіх-небудзь звенняў, так званых цэнтраў, дзе б знаходзіўся пэўны набор тэхнікі і ім маглі б карыстацца сельвыканкамы. І каб такіх цэнтраў было 1—2 на раён. Пакуль цяжка сказаць, у якой форме гэта будзе зроблена. Але гэта павінна быць.

— Раскажыце падрабязней пра каманду, з якой трэба будзе працаваць.

— Калі браць абласны ўзровень, гэта 55 дэпутатаў, з якіх большасць мужчыны. Моцна прадстаўлены сістэма аховы здароўя (гэта кіраўнікі абласнога дыягнастычнага цэнтра, дзіцячай абласной бальніцы, абласнога ўпраўлення аховы здароўя і гэтак далей), адукацыя (шэраг дырэктараў дзіцячых садкоў, школ), аграрная сфера (у тым ліку фермеры), прамысловы сектар (кіраўнікі «Белшыны», «Бабулінай крынкі», «Магілёўаблгаза», СЭЗ «Магілёў»), эканоміка. Вельмі гарманічны падабраўся склад дэпутатаў, шырока прадстаўлены ўсе сацыяльна-эканамічныя сферы вобласці. І гэта дазволіць эфектыўна разглядаць многія пытанні.

Адчувальна абнавіўся склад старшынь сельскіх і райсаветаў, таму важна правесці пэўную вучобу для таго, каб нававыбраныя змаглі пабачыць падыходы ў рабоце калег з іншых раёнаў, пераняць вопыт. Вучыцца будзем у лепшых, а выязджаць да горшых. Гэта дасць стымул падцягнуць сябе. Планую таксама правесці вучобу з дэпутатамі сельскіх і раённых Саветаў, каб паказаць, якая існуе нарматыўная база для іх работы, якімі яны валодаюць магчымасцямі для вырашэння тых ці іншых пытанняў. Спадзяюся, што наша праца будзе плённай.

Што залежыць ад дэпутата?

— Чаго не хапае дэпутату, каб яго работа была найбольш эфектыўнай?

— Мы ведаем, што ўсе дэпутаты, акрамя старшынь сельскіх Саветаў, райсаветаў і гарсаветаў, — гэта не вызваленыя ад сваёй асноўнай работы людзі. Таму ўсе грамадскія справы робяцца імі ў вольны ад працы час. Бывае, чалавек мае жаданне нешта зрабіць, але не можа з-за вялікай асноўнай нагрузкі. Але сустракаюцца людзі, якія сталі дэпутатамі, але да канца не разумеюць, наколькі гэта сур'ёзная нагрузка, і іх актыўнасць з часам пачынае крыху падаць. Сваю ролю бачу ў тым, каб падтрымліваць ініцыятывы дэпутатаў, каб яны на працягу тэрміна сваіх паўнамоцтваў не пераставалі ўносіць прапановы па паляпшэнні ўзроўню жыцця выбаршчыкаў.

— Некаторыя скептычна выказваюцца пра дзейнасць дэпутата. Маўляў, ад іх нічога не залежыць...

— Заўсёды як дэпутат максімальна імкнуўся трымаць руку на пульсе, сустракацца з людзьмі, унікаць у іх праблемы. І калі кажуць: «Ну што вы можаце?», маўляў, улада ў «вертыкалі», а ў вас — нічога, у мяне гэта выклікае здзіўленне. Мы ўсе жывём у адной краіне і ўсе нацэлены на садзейнічанне яе развіццю, кожны на сваім працоўным месцы. Канешне, у дэпутата няма сур'ёзных эканамічных рычагоў, але ён можа своечасова данесці тую ці іншую праблему, прапанаваць шляхі яе вырашэння на ўзроўні адміністрацыі, выканаўчай улады. Гэта дапамагае правільна накіроўваць тыя рэсурсы, якія ёсць у вобласці, для максімальна эфектыўнага развіцця і стварэння камфортных умоў для насельніцтва. Толькі разам дэпутат і выканаўчая ўлада змогуць дабіцца большага.

> Калі абласны Савет дэпутатаў зацвярджае бюджэт, неабходна, каб сродкі накіроўваліся менавіта ў тыя сферы, якія найбольш хвалююць, патрабуюць тэрміновага вырашэння.

— Многія раёны зараз добра працуюць з еўрапейскімі грантамі, прапаноўваюць ініцыятывы, заахвочваюць мясцовае насельніцтва. І дэпутаты пры гэтым выконваюць не апошнюю ролю...

— Гэта вельмі добры кірунак. У рамках семінараў мы збіраемся такі вопыт таксама распаўсюдзіць. Тут мне вельмі імпануе Слаўгарадскі раён, які ўцягвае ў ініцыятыўную дзейнасць іншыя раёны. Кожная капейка дарагая, і калі нехта ўмее яе прыцягнуць, гэта добра.

— Як павінна будавацца работа дэпутата з насельніцтвам? Часта людзі не ведаюць нават, хто ў іх дэпутат?

— На жаль, гэта так. Калі мне, яшчэ як намесніку старшыні аблвыканкама, званілі на прамыя лініі, я цікавіўся, як пытанне было прапрацавана з дэпутатам. Многіх яно ставіла ў тупік. Гэта не гаворыць пра тое, што дэпутаты працуюць дрэнна, гэта сведчыць, што прававая асвета насельніцтва вымушае жадаць лепшага. Людзі не прывыклі цесна працаваць з дэпутатамі. Вядома, што тут ёсць віна і саміх дэпутатаў. Трэба часцей сустракацца з выбаршчыкамі, працоўнымі калектывамі, прадстаўнікамі тэрытарыяльнага самакіравання, удзельнічаць у сумесных акцыях, разглядзе цяжкіх жыццёвых сітуацый на месцах. І так павінна быць на працягу ўсяго дэпутацкага тэрміну.

Карысны досвед

— Што асабіста вам дапамагае ў рабоце? Ці ўлічваеце вопыт іншых калег?

— Так. Зараз уважліва знаёмлюся з літаратурай, якая непасрэдна датычыцца работы народных абраннікаў. Вось справаздача дэпутата парламента Вольгі Петрашовай, практычныя дапаможнікі дэпутатаў па Брэсцкай, Гродзенскай абласцях, зборнік матэрыялаў Магілёўскага Савета дэпутатаў, брашура па дзейнасці асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў. Магілёўскай вобласцю быў распрацаваны Дзённік старасты, а Чавусы зрабілі ў дапамогу дэпутату карысную брашуру, дзе сабраны нарматыўныя акты, на якія трэба абапірацца. Ёсць вопыт, практыка, але інфармацыя вельмі разрозненая. Даручым камісіі па самакіраванню вывучыць наш вопыт і выпрацаваць рэкамендацыі, якія зацвердзім на ўзроўні аблсавета і прапануем усім дэпутатам працаваць у рамках гэтых рэкамендацый. Гэта будзе своеасаблівы дзённік дэпутата, або пашпарт выбарчай акругі, дзе будуць адлюстраваны нарматыўныя дакументы, рэкамендацыі па арганізацыі работы, характэрныя асаблівасці раёна, выбарчай акругі (колькі жыве людзей, колькі з іх ветэранаў, інвалідаў, сацыяльна небяспечных і гэтак далей). Каб дэпутат выразна разумеў праблематыку свайго раёна, акумуляваў праблемныя пытанні і распісваў, як працаваў па тым ці іншым пытанні, што з гэтага атрымалася. Такая работа дазволіць нам сістэматызаваць пытанні, якія паступаюць, прааналізаваць іх на раённым, гарадскім, абласным узроўнях і знайсці нейкія асноўныя праблемы, характэрныя для таго ці іншага раёна.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Пра сябе:

— Па характары я прынцыповы і ўпарты. Калі бачу, што без жорсткага рашэння пытанне не скранецца, прымаю яго. Не павінна быць тупання на месцы. Але перад тым як вызначыцца, мне заўсёды трэба ўпэўніцца, што жорсткая пазіцыя прынясе справе карысць. Таму ўважліва вывучаю сітуацыю, выслухваю меркаванне кампетэнтных людзей, аналізую свой вопыт і вопыт іншых. А калі рашэнне прынятае, дабіваюся, каб яно было яшчэ і выканана. Інакш людзі проста не будуць табе верыць.

ОБЪЯВЛЕНИЕ
о повторных торгах

Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши объявляет о проведении повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего должнику Сливкину Александру Леонидовичу.

Номер лота, вид выставляемого на торги имущества: Лот № 1, объект: Легковой автомобиль.

Наименование, начальная цена, место нахождения: Легковой автомобиль «АУДИ 80» 1989 года выпуска, рег. знак 0505КТ в количестве 1 шт., начальная цена – 436,80 белорусского рубля, место нахождения – г. Орша, 2-й пер. Коммунальный, 2.

Имеющиеся обременения в отношении имущества – без обременений.

Место, дата и время проведения повторных торгов: г. Орша, ул. А. Островского, 36, каб. 12; 10 мая 2018 г. в 10.00.

Справочная информация: Ильмухин Артур Сергеевич, судебный исполнитель, тел.: 8 (0216) 543212, 8 (033) 399-83-26, отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, адрес: ул. А. Островского, 36, г. Орша, адрес электронной почты opi217@minjust.by

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 8 мая 2018 г. на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № BY22AKBB36429030007942200000, филиал № 215 ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Орша, код AKBBBY21215.

Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).

В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем).

Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» сообщает, что 15 мая 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 состоится повторный аукцион:

по продаже земельного участка **У-1422 микрорайон «Зарица-4»** для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома с кадастровым номером **440100000001009887** площадью **0,1381 га**.

Начальная цена продажи: **15 769,92 рубля,** сумма задатка – **3200 рублей.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **по 10 мая 2018 года.**

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720537, 742095.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

УНП 590727594

МЕРКАВАННІ

ПЯКУЧЫ ПАРАСОН

Апёкі рознай ступені цяжкасці, алергічныя рэакцыі, павышаная пігментацыя скуры і высокая тэмпература... З такімі сімптомамі да ўрачоў звяртаюцца ахвяры баршчэўніку Сасноўскага, які сваё «прозвішча» атрымаў у гонар даследчыка флоры Каўказа. Менавіта адтуль расліну завезлі ў нашы шыроты ў якасці сіласнай культуры. Сёння пытанне для многіх гаспадароў: як змагацца з баршчэўнікам?

Аксана ЕСЬМАН, намеснік старшыні Сеніцкага сельвыканкама Мінскага раёна:

— У нашым сельсавеце не практыкуецца, каб людзі самі выкаранялі расліну. Для знішчэння баршчэўніку мы выбіраем падрадчыка. Спецыялістам паказваем месца, дзе рассеялася шкодная расліна, і яны выкарыстоўваюць супраць яе хімічныя рэчывы. Праблема баршчэўніку, на жаль, характэрная для нашага раёна. Ёсць пэўныя цяжкасці: мы маем права прымяняць сродкі барацьбы толькі на тэрыторыі сельсавета. Але баршчэўнік расце і на палях сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, і на прыватных участках. Насенне разлятаецца, і ён зноў вырастае.

Сяргей МЕРНЫ, старшыня Кіраўскага сельвыканкама Слуцкага раёна:

— На грамадскай тэрыторыі сельсавета практычна няма праблемы з баршчэўнікам. Узнікаюць пытанні толькі ў сельскіх гаспадарках, але яны самастойна змагаюцца з раслінай. Выкараняюць яе з дапамогай хіміі. Займаюцца гэтым работнікі, якія прайшлі медыцынскі агляд і дапушчаны да работы з пестыцыдамі. Выкарыстоўваюць для гэтага апырсквальнікі. Калі заўважаем, што на пэўнай тэрыторыі з'яўляюцца парасткі баршчэўніку, адразу высякаем, каб не было распаўсюджвання. Дзе можам, заворваем участкі.

Аляксандр САРОКА, начальнік раённай інспекцыі прыродных ресурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Стаўбцоўскага райвыканкама:

— Некалькі дзён таму мы падвялі вынікі конкурсу сярод падрадчыкаў і вызначылі, хто будзе займацца ліквідацыяй баршчэўніку. Сродкі для гэтага выдзелены з абласнога бюджэту. Сёлета ў нашым раёне такая работа ўскладзена на спецыялізаваную службу, раней гэта была задача непасрэдна землекарыстальнікаў. У нашым раёне баршчэўнік займае невялікую плошчу — прыкладна сем гектараў. Сюды ўключаны і прыдарожныя палосы, і лясныя гаспадаркі, і сельскагаспадарчыя палі. У параўнанні з іншымі тэрыторыямі гэта няшмат, таму што мы змагаліся з баршчэўнікам і будзем працягваць гэтую работу. Спадзяёмся, што пасля пяці гадоў выкарыстання хіміі расліна знікне.

Валерый ПРОХАРАЎ, доктар біялагічных навук, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі:

— Мы праводзім экспертызы па выяўленні насення баршчэўніку ў глебе. Усе арганізацыі сталіцы павінны прайсці гэтую працэдуру, каб не было распаўсюджвання шкоднага грунту. Калі сляды расліны знойдзены, мы даём рэкамендацыі па барацьбе. Яны ўключаюць комплекс агратэхнічных і хімічных мерапрыемстваў. Але трэба мець на ўвазе, што пасля апрацоўкі ўсё роўна ў глебе застаецца насенне. Неабходны маніторынг тэрыторый. Забруджаны грунт трэба перамяшчаць у больш глыбокія слаі глебы і як мінімум пяць-шэсць гадоў яго не чапаць. Скошванне праводзіцца, але яго плюс толькі ў тым, што яно не дае з'яўляцца новаму насенню. І скошванне праводзяць ад трох да пяці разоў на сезон, бо расліна зноў будзе вырастаць з кораня. Галоўнае ж прафілактычнае мерапрыемства — не даць магчымасці забруджанаму насеннем грунту трапіць на чыстыя тэрыторыі.

Марыя ДАДАЛКА.

НЕСТАНДАРТНЫ ПАДЫХОД

БІЯПАЛІВА З ЗЯЛЁНАЙ МАСЫ

Дзеля гэтага баршчэўнік можна нават... высяваць



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СЯРОД 12 аўтарскіх праектаў, якія маладыя інаватары Міншчыны прадставілі ў фінале рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі», была і распрацоўка выпускніка клецкай гімназіі Аляксандра Плоткі. Яго ідэя пад назвай «Зялёная нафта» — гэта прапанова здабываць біяпаліва (тэхнічны спірт) ...з зялёнай масы баршчэўніку Сасноўскага. Аўтар нават прапануе высаджваць гэтую расліну!

У адказ на маё пытанне, чаму б нам, бульбяной краіне, не выкарыстоўваць у якасці сыравіны для вытворчасці біяпаліва той жа бульбянік (чаго-чаго, а гэтага дабра ў нас хапае). Саша пярэчыць:

— Такі падыход няправільны. Калі сабраць бульбянік, як жа будуць развівацца клубні?

І спакойна працягвае:

— У Бразіліі спірт вырабляюць з цукровага трыснягу, у Амерыцы — з кукурузы. У Беларусі для вытворчасці біяэтанолу шырока выкарыстоўваюць збожжавыя культуры, буракі, бульбу, кукурузу, рапс і інш. Сёлета сабекошт 1 л беларускага этанолу складае 0,8—1,1 долара. З сацыяльнага і эканамічнага пунктаў гледжання актуальнай з'яўляецца распрацоўка новай тэхналогіі атрымання біяэтанолу — для зніжэння яго кошту. Вырашыць гэтую праблему можна, калі выкарыстаць у якасці сыравіны зялёную масу баршчэўніка Сасноўскага. Вялікая колькасць у зялёнай масе цукру і высокая ўраджайнасць расліны дазволяць атрымаць таннае біяпаліва. Акрамя атрымання тэхнічнага спірту, можна паралельна выконваць яшчэ адну вельмі карысную справу — кантраляваць «шкодную» расліну.

Працэс вытворчасці біяпаліва — такі ж, як і з цукровымі культурамі. Баршчэўнік здрабняецца, зялёная маса адпраўляецца на адціскание пад прэс, атрыманы сок фільтруецца, потым ён трапляе ў брадзільныя апараты. Затым ідзе перагонка, і на выхадзе атрымліваецца тэхнічны спірт — мацункам не менш за 96 працэнтаў.

— Але гэта яшчэ не ўсё. Брага, якая засталася пасля перагонкі, можа ісці на корм жывёлам, паколькі захавала ўсе складовыя часткі зыходнай сыравіны, за выключэннем цукру. А вось цвёрдую адціснутую фракцыю можна было б выкарыстоўваць для вытворчасці цвёрдага біяпаліва (пелет), — працягвае Саша.

Аўтар ідэі, апроч выкарыстання дзікарослага баршчэўніку Сасноўскага, прапануе таксама спецыяльна яго вырошчваць, каб загрузіць патэнцыйныя магутнасці.

Зноў жа — як так? З папуляцыяй цяжка змагацца, выдаткуюцца вялікія грошы, а тут — яшчэ і сеяць атрутную расліну? І гэта пытанне аўтар прапрацаваў.

— Калі гаварыць, дзе менавіта развозіць баршчэўнік, дык гэта, напрыклад, тыя землі, што былі выведзены з сельскагаспадарчага абароту на забруджаных у выніку чарнобыльскай катастрофы тэрыторыях. Галоўнае — не даваць расліне даходзіць да стану бутанізацыі, каб яна не магла размнажацца генератыўным (насенным) шляхам, — тлумачыць Аляксандр.

А як увогуле прыйшла ідэя выкарыстоўваць баршчэўнік Сасноўскага для вытворчасці біяпаліва? Хлопец згадвае неабходнасць барацьбы з раслінай і... цэны на бензін.

Паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу ва ўсіх краінах свету патрабуе пастаяннага і ўсё большага і большага з кожным годам павелічэння выпрацоўкі і спажывання энергетычных рэсурсаў і энергіі. Гэта, у сваю чаргу, выклікае павелічэнне спажывання вуглевадароднай сыравіны, запасы якой не бязмежныя. Праблемы з яе атрыманнем і пастаянны рост цэн на прыродныя рэсурсы прымушаюць усе краіны прымаць меры да пошуку нетрадыцыйных аднаўляльных крыніц энергіі. Менавіта таму ў апошні час у Беларусі пачынае інтэнсіўна развівацца біяэнергетыка, заснаваная на атрыманні паліва і энергіі з біямасы.

Праект Аляксандра Плоткі, які ён распрацоўваў разам са сваім навуковым кіраўніком (а па «сумяшчальніцтве» — настаўніцай і маці Марынай Іванаўнай), трапіў на фінальную выстаўку конкурсу «100 ідэй для Беларусі» і адзначаны экспертамі сертыфікатам пераможцы ў намінацыі «Новае экалагічнае рашэнне». Сам Саша кажа, што дадзеная прапанова — прынцыпова новы падыход да энергазберажэння ў Беларусі. Хто яго ведае, можа, гэта і сапраўды так?..

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАЦЬ АДПОР

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Нагадаем, што баршчэўнік утрымлівае вялікую групу біялагічна актыўных рэчываў (фуракумарынаў, эфірнага алею і інш.). Сок расліны з-за фуракумарынаў пад уздзеяннем святла (асабліва ўльтрафіялетавай часткі яго спектра) пры пападанні на скуру чалавека не толькі ўзмацняе яе пігментацыю, але і прыводзіць да сур'ёзных апёкаў. У фуракумарынаў ёсць здольнасць да так званай фотасенсібілізацыі, гэта значыць моцнага павышэння адчувальнасці арганізма да святла. Таму найбольш небяспечныя апёкі можна атрымаць у спякотную пару года.

Нават калі кантакт з сокам ці раслінай адбыўся ў цёмны час сутак, дык пры апраменьванні скуры натуральным святлом на наступны дзень праяўляюцца тыя ж клінічныя сімптомы. У вячэрні ці начны час, рухаючыся праз зараснік баршчэўніку, можна не заўважыць, як сок з выпадкова пашкоджанага сцябла ці лісця трапіць на скуру, аднак потым гэта ўсё адно выкліча непрыемныя сімптомы.

Варта таксама нагадаць, што калі вы апякліся баршчэўнікам, неабходна адразу звяртацца ў найбліжэйшую медустанову. Трэба памятаць, што пры кантакце, напрыклад, з крапівой апёк адчуваецца адразу. А з гэтай шкоднай раслінай усё крыху інакш: напачатку чалавек нічога не адчувае, але праз некалькі гадзін узнікае моцны боль, на целе з'яўляецца пачырваненне, а затым вялікія пухіры. Яны моцна свярбяць, а загойваюцца вельмі марудна — на працягу дзесяці дзён і больш. На скуры пасля іх могуць застацца даволі вялікія рубцы.

> Вельмі небяспечна дапусціць, каб расліна трапіла ў лясныя ўгоддзі. Калі гэта адбудзецца, «выцягнуць» баршчэўнік адтуль будзе немагчыма.

Цвіце баршчэўнік велізарнымі белымі «парасончыкамі», якія і прыцягваюць да яго ўвагу цікаўных, у тым ліку і дзяцей. Адбываецца гэта з чэрвеня да жніўня. Пладаносіць ён з ліпеня да верасня, а распаўсюджваецца найперш на ўзбочынах дарог, рэчышчаў, вакол закінутых фермаў і населеных пунктаў. Вельмі небяспечна дапусціць, каб расліна трапіла ў лясныя ўгоддзі. Калі гэта адбудзецца, «выцягнуць» баршчэўнік адтуль будзе немагчыма. Увогуле, ёсць некалькі стадый укаранення агрэсіўнай расліны: занос, скажам, на ўзбочыну дарогі, затым утварэнне суцэльнага зарасніку, пад якім гіне ўсё жывое, і трэцяя стадыя — пранікненне ў натуральныя комплексы. Напачатку на перыферыі, а затым паўсюль адбываецца суцэльнае выцясненне абарыгенных відаў і ўтварэнне гіганцкага зарасніку на плошчы ў дзясяткі і сотні гектараў. У залежнасці ад канкрэтных умоў папуляцыя можа прасунуцца за год на адлегласць ад некалькіх кіламетраў да некалькіх дзясяткаў кіламетраў.

Сярэдні рост папуляцыі за год складае ад 25 да 30 працэнтаў. Іншымі словамі, калі не знішчаць расліну, распаўсюджванне баршчэўніку за гэты тэрмін павялічыцца на трэць. Адна расліна за год дае больш за 10 тысяч штук насення. Калі баршчэўнікам занятая вялікая тэрыторыя, за год насення атрымліваецца больш, чым насельніцтва Беларусі. Раней спрабавалі розныя спосабы барацьбы з навалай.

Баршчэўнік уступае ў рэпрадукцыйную стадыю на другі-чацвёрты год, але пры штогадовай падрэзцы (да цвіцення) расце на адным месцы да 8—12 гадоў. У расліны магутнае сцябло (вышынёй 1,5—2,5 метра, з дыяметрам каля кораня чатыры-шэсць сантыметраў). Дыяметр лісця можа дасягаць 40—50 сантыметраў. Насенне пакрыта шчыльнай лупінай. Пасля цвіцення і плоданашэння расліна адмірае. На ўчастках, дзе спрабуюць вывесці гэтага агрэсара, трэба праводзіць глыбокае ўзворванне. Пры гэтым мець на ўвазе, што насенне, якое праляжала ў глебе ў набрынялым стане год-два, здольнае прарастаць і потым даваць усходы.

Баршчэўнік Сасноўскага — расліна мароза- і холадаўстойлівая. Пад снегам вытрымлівае маразы да мінус 40—50 °С. Патрабавальная да вільгаці, глебы «выбірае» пладародныя: лёгка- і сярэднесугліністыя, супясчаныя. На бедных і кіслых расце вельмі дрэнна.

■ За кадрам

ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА ЭКАНОМІІ

ЕЩЁ ДЕШЕВЛЕ

Зрабіць рамонт і не залезці ў даўгі, згатаваць «з нічога» смачныя і карысныя стравы, шыкоўна выглядаць за капейкі — уявіце сабе, гэта цалкам рэальна. Як эканоміць разумна, каб наяўнага бюджэту хапала на ўсе патрэбы, падказвае гледачам праграма «Яшчэ танней», што вось ужо некалькі сезонаў выходзіць на канале «МІР». Пра тое, з чаго пачыналася школа эканоміі і як здымкі праекта адбіваюцца на паўсядзённым жыцці, «Звязда» распытала яго аўтараў і вядучых — Алену КУПЧЫК і Аляксандру КУЛАКОВУ.

«Вы ўмееце жыць па сродках? А мы падкажам, як зрабіць многія рэчы яшчэ танней!» — абяцае каманда тэлепраекта.

— Ідэя эканоміі ў наш крызісны час ляжыць на паверхні, але як вы ўсё ж прыйшлі да яе тэлевізійнага ўвасаблення і як вырашалі, з чаго пачаць?

— Пачатковы фармат, касцяк праекта быў зададзены Масквой — цэнтральны офіс Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» быў зацікаўлены ў спажывецкай праграме, якая давала б карысныя парады, гэткія «лайфхакі» для жыцця. Гады два таму была неверагодна папулярная тэма рабіць штосьці сваімі рукамі, і ад гэтага мы адштурхоўваліся. Праграма атрымалася вельмі працаёмкая, і тэхналагічна не самая простая: у нас вельмі многа здымачных месцаў, розных лакацый, каб гледачам было цікава. Таму мінімальны пакет праграм рыхтаваўся да запуску доўга, прыкладна паўгода, — успамінае Алена Купчык.

«Яшчэ танней» здымаецца ў беларускіх рэаліях, з айчыннымі майстрамі-ўмельцамі і матэрыяламі. Аднак праграма дэманструецца і ў іншых краінах Садружнасці, таму яе стваральнікі, робячы параўнальную калькуляцыю тых ці іншых рэчаў, пераводзяць кошты ў доларавы эквівалент і пазначаюць, што прыведзеныя ідэі актуальныя для розных краін. Гледачы, мяркуючы па водгуках, лічаць гэтаксама. «Нам пастаянна прапаноўваюць нейкіх герояў з Масквы і Падмаскоўя, — заўважае Саша Кулакова, — даводзіцца тлумачыць, што мы працуем у Беларусі».

— У кадры ў вас выходзіць усё складна, лёгка і дынамічна. А па-за кадрам часта адбываюцца неспадзяванкі?

— Пастаянна! — у адзін голас адказваюць, смяючыся, дзяўчаты.

— Напрыклад, днямі наш рэжысёр ехаў са здымак, лежачы пад шведскай сценкай, — дзеліцца Аляксандра. — Проста гэтая сценка не ўлязала ў мікрааўтобус, таму рэжысёру давялося скруціцца неймаверным чынам, каб падлезці пад яе, — і пры гэтым ухітрыцца здымаць сэлфі, каб выкласці ў сацыяльных сетках і заінтрыгаваць аўдыторыю...

— Мы і самі пастаянна ездзім з поўнымі пакетамі самых неверагодных рэчаў: рэквізітам, нейкімі інструментамі, драўлянымі планкамі, швейнымі машынкамі. Нядаўна я асабіста цягнула машынку ў 14 кілаграмаў, — дадае Алена. — Аднойчы, каб пашыць паліто, маштабна закупаліся па сэканд-хэндах, бо не маглі знайсці ў крамах аснову патрэбнага колеру... Так што нас ужо добра ведаюць у будаўнічых крамах, швейных аддзелах, гандлёвых пунктах з фурнітурай і біжутэрыяй.

Аднойчы дырэктар здымачнай групы тэлефанавала ў будаўнічую краму і цікавілася, колькі патрэбна шнура, каб абматаць шыну. Кансультант здзівіўся, але парэкамендаваў узяць 15 метраў. А аказалася, патрэбна каля 65 — давялося ездзіць, дакупаць. А другім разам здымалі ў Жлобіне з хлопчыкам-падлеткам праграму пра вопыты кшталту «юны хімік» — чатыры гадзіны спрабавалі паўтарыць эксперыменты, якія бачылі ў інтэрнэце, але нічога не атрымлівалася. Выручыў аператар, які прыгадаў сваё школьнае захапленне хіміяй, знайшоў тое-сёе з матэрыялаў і ўратаваў праграму ад ганебнага правалу.

— Дарэчы, гэта тое, што мы неаднаразова праверылі падчас здымак: інтэрнету нельга верыць, таварышы! Канешне, не ўсе парады там лухта, але добрая палова. Часта чапляемся за падгледжаную на прасторах сусветнага павуціння цікавую ідэю, паўтараем адзін у адзін — а не выходзіць. Даводзіцца дапрацоўваць прыведзеныя рэцэпты, карэктаваць, словам, прыводзіць інтэрнэт-парады ў адпаведнасць рэаліям. Так што, напэўна, у кожнай праграме ёсць свае закадравыя цікавінкі, творчы выклік і карысны вопыт.

— На першы погляд, тут такая прастора для творчасці, што не ведаеш, за якую тэму найперш учапіцца.

— Так толькі здаецца. Каварства гэтага праекта ў тым, што вялізнае неўзаранае поле пасля першага сезона звужаецца да некалькіх асноўных сфер: будаўніцтва і афармленне памяшканняў, харчаванне, гардэроб, спорт і здаровы лад жыцця, касметалогія і прыгажосць, дзеці і іх патрэбы.

— Няўжо і ўсё? А, скажам, транспарт?

— О, гэта была адна з самых цяжкіх у працы праграм, пры ўспамінах аб ёй я дагэтуль хрышчуся, — уздыхае Алена. — Нам жа трэба было правесці майстар-клас і нешта зрабіць сваімі рукамі, а што тут прыдумаеш? У выніку прыдумлялі веласіпед — у прамым сэнсе: збіралі электравеласіпед, і лепш не пытацца, як гэта атрымлівалася... Наогул, калі б не таленавітыя майстры-энтузіясты, апантаныя сваёй справай, якія абсалютна бясплатна прыходзяць нам на дапамогу і робяць неверагодныя рэчы, — то не атрымалася б ні «транспартная», ні шмат якія іншыя праграмы. Гэта проста цуд, што сярод нас ёсць такія людзі.

— Іх яшчэ паспрабуй знайдзі...

— Гэта робіць наша выдатная адміністратар Таня, здольная задаволіць самыя вар'яцкія запатрабаванні. Бывае, усклікне: «Гэта немагчыма!» А праз дзень-другі знаходзіць менавіта тое, што было патрэбна, і ўгаворвае ўсё новых герояў прыняць наш немаленькі табар: вядучая, рэжысёр, два аператары, гукарэжысёр — і падзяліцца на камеру сакрэтамі майстэрства.



Падчас здымак вядучыя насамрэч робяць усё сваімі рукамі — і шыюць, і фарбуюць, і пірагі пякуць, і шрубы ўкручваюць.

— А бывае, што людзі просяцца ў праграму самі — здыміце мяне, здыміце?

— Так, у чым збольшага Сашына заслуга, — ківае Алена на сувядучую, — бо з яе прыходам у праект пачалося развіццё і піяр у сацыяльных сетках. Іх рэсурс я раней, шчыра кажучы, недаацэньвала.

«Аднойчы дырэктар здымачнай групы тэлефанавала ў будаўнічую краму і цікавілася, колькі патрэбна шнура, каб абматаць шыну».

— Мы яшчэ не дайшлі да некаторых пляцовак, — дадае Саша, — трэба стварыць старонкі ў «Аднакласніках» і «УКантакце». Але пэўныя вынікі ўжо відаць, і майстры, рамеснікі, стылісты, дызайнеры часта самі падкідваюць ідэі. Напрыклад, адна дзяўчына прапанавала майстра, які рабіў мастацкую коўку для палаца Максіма Галкіна і мэблю ў стылі стымпанк. Але гэты чалавек жыве ў Маскве, таму я адказала, што, калі ў яго ёсць выхад на беларускіх калег, з задавальненнем будзем супрацоўнічаць. Мы наогул заўжды адкрытыя для прапаноў, адзіная ўмова для майстар-класаў — яны мусяць быць нескладанымі, каб мог паўтарыць кожны чалавек.

— У праграмах прыкладнога кшталту заўжды важная зваротная сувязь. Як ацэньваюць вашу працу гледачы?

— На афіцыйных старонках праекта хваляць, і гэта, натуральна, вельмі прыемна. Героі, якія здымаліся ў той ці іншай праграме, робяць на нас спасылкі родным і сябрам, так вось пакрысе і рушым у народ, — усміхаецца Саша. — Хоць ёсць і крытыка. Пасля сакавіцкай праграмы пра дызайн дзіцячага пакоя адзін хлопец з маленькага расійскага гарадка зрабіў сваю калькуляцыю, колькі будзе каштаваць зрабіць гірлянду для ўпрыгожання, і сцвярджаў, што выходзіць зусім не танна. А некаторыя пісалі, што прапанаваная майстрам ідэя зрабіць са старой пакрышкі пуфік — неэкалагічная, бо такім рэчам няма чаго рабіць у дзіцячым пакоі. Мы ўлічваем усе меркаванні і заўвагі, бо гэта важна для далейшага развіцця праекта.

— Ці многія ідэі і майстар-класы са здымак пераносіце ва ўласнае жыццё?

— Так, і не толькі мы. Пачаць хоць бы з таго, што пасля нашых кулінарных праграм уся здымачная група, падлічыўшы штодзённую эканомію, перастала абедаць у кафэ і пачала насіць «ссабойкі». Адзін з аператараў узяў ідэю з шынай-пуфікам на ўзбраенне для афармлення дачы, другі аздобіў дома сценку дэкаратыўнай цаглянай кладкай; наша адміністратар нядаўна звязала стыльную сумачку а-ля Како Шанэль — такія прадаюцца ў брэндавых буціках за 500 долараў. А я зрабіла дома навагодняе імбірнае пячэнне-мішкі з пажаданнямі — цудоўны рэцэпт! — гаворыць Алена. — Цяпер гэта ўжо сямейная традыцыя, і кожны чакае свайго мішку... А нядаўна на майстар-класе па зборцы шведскай сценкі з падручных матэрыялаў — чаранкоў рыдлёвак ды грабляў — я з велізарным здзіўленнем адчула, што ўсе гэтыя чужынскія для мяне словы «фрэзы», «шрубы» і «самарэзы» — зразумелыя, калі тлумачыць прафесіянал, які дапамагае не нарабіць крыўдных памылак і прыйсці да мэты.

— Наогул, мне здаецца, можна па пальцах пералічыць тыя майстар-класы, якія мы не выпрабоўвалі ва ўласным жыцці, — дадае Саша. — Я вось навучылася пячы хлеб дзякуючы Лене і адной з нашых праграм. Раней лічыла, што гэта вельмі складаны працэс, які абавязкова патрабуе шмат дадатковых прылад, формачак, хлебапечкі, а аказалася, што патрэбны жывая закваска, вада, мука і соль — і атрымліваецца такая смаката! Потым нават з карыслівым інтарэсам прыгляделася ў кожнай праграме: чаго я яшчэ не рабіла, што хацелася б паспрабаваць?

— «Яшчэ танней» жыве ў эфіры ўжо больш як год. Плануеце абнаўляць фармат?

— У нас ёсць задумка не тое каб перафарматавацца, але зрабіць пакеты праграм, якія датычыліся б асобнай тэмы. Бо сёння наша мэтавая аўдыторыя размытая: Саша робіць праграму пра рэстаўрацыю дачнай мэблі, а я наступную — пра кулінарыю, далей — пра гардэроб... Таму, дасць бог, будзе новы сезон — хочацца зрабіць шэраг мэтавых праграм: пра інтэр'ер, харчаванне, здароўе і г. д., адпаведна, праанансаваць кожны пакет, каб гледачы маглі выбраць тое, што ім даспадобы. Хоць, мне здаецца, наш праект не з тых, якія можна рабіць бясконца, як «Поле цудаў».

— Але цікавых майстар-класаў, якія дапамагаюць і сэканоміць, і зрабіць эксклюзіўныя рэчы, у якія ўкладваеш частку душы, насамрэч многа, — не згаджаецца Саша Кулакова. — І пасля кожнага майстар-класа пачынаеш больш любіць і цаніць рэчы хэнд-мэйд, а разам з тым і сябе — змог, справіўся.

— Галоўнае, каб гэта было цікава нам самім — вось найлепшы маркер, — лічыць Алена. — Калі ты гарыш справай, якую робіш, то і вынік будзе цікавы для гледачоў. Вельмі часта важна не навучыць рабіць штосьці канкрэтнае, а даць штуршок, ідэю; не бойцеся прыкласці пэўныя намаганні, нават незнаёмая справа з дапамогай майстра прынясе плён.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота аўтара і з архіва праграмы

Дасье «Звязды»

«Яшчэ танней» — па сутнасці, зборнік майстар-класаў, парад і падказак, як замест дарагіх паслуг і тавараў скарыстаць даступныя матэрыялы і атрымаць не горшы вынік. Часта гэта не гатовыя рэцэпты, а толькі штуршок для фантазіі і практычнасці. На сёння выйшла ўжо каля паўсотні выпускаў праграмы.

Магія старых лічбаў

«СЕМ СТАРЫХ І АДНА ДЗЯЎЧЫНА»
«Беларусь 3», 27 красавіка

Гераіня музычнай камедыі 1968 года, трэнер Алена Вялічка, пасля заканчэння інстытута марыць пра бліскучую кар'еру і выхаванцаў-чэмпіёнаў, а атрымлівае... прызначэнне метадыстам у аздараўленчую групу для пажылых.

Звольніцца па ўласным жаданні з «зайздроснага» месца размеркавання нельга — хіба толькі кіраўніцтва само звольніць. І Алена пачынае знясільваць вучняў напружанымі трэніроўкамі. Толькі яны чамусьці не паддаюцца на правакацыі, а ўсё больш захапляюцца сваім трэнерам і, наладжваючы яе асабістае шчасце з адзіным маладым хлопцам у групе, самі не заўважаюць, як прыводзяць сябе ў добрую форму і становяцца дружнай і моцнай камандай.

Рэпліка: «Жанчыны ўжо ў валейбол гуляюць!»

«ІГРА Ў ЧАТЫРЫ РУКІ»
СТБ, 28 красавіка

Сімпатычны аферыст Аляксандр Дзюпрэ «спецыялізуецца» на ачмурэнні заможных удоў, з якіх ён неверагодна ўмела выцягвае грошы. Справы ў яго ідуць цалкам няблага да той пары, пакуль альфонс выпадкова не аказваецца ўцягнутым у міжнародны прамысловы шпіянаж, які закранае стратэгічныя інтарэсы Францыі.

З-за чаго фільм варта паглядзець або перагледзець наноў? З-за любові да французскага кіно, настальгіі па атмасферы 80-х, але перш за ўсё, канешне, з-за шыкоўнага і абаяльнага Жан-Поля Бельмандо.

Рэпліка: «Я груба не працую, я рамантык».

«ДВАНАЦЦАЦЬ КРЭСЛАЎ»
«МІР», 28 красавіка

Можна спрачацца, выкліканы поспех фільма літаратурнай асновай Ільфа і Пятрова, рэжысёрскім талентам Леаніда Гайдая альбо харызмай Арчыла Гаміяшвілі (выбранага з 20 прэтэндэнтаў!) ці ўсім у сукупнасці. Але факт застаецца фактам: стужка стала ў 1971-м лідарам савецкага пракату — яе паглядзелі звыш 39 мільёнаў чалавек.

...Былы прадвадзіцель дваранства, а цяпер сціплы справавод загса Іпаліт Мацвеевіч Вараб'янінаў даведаўся ад цешчы, што памерла, пра скарб, схаваны пад абіўкай аднаго з 12 крэслаў гарнітура работы майстра Гамбса. Дапамагчы ў пошуку гарнітура бярэцца, канешне, не бескарыслівы, авантурыст і «вялікі камбінатар» Астап Бендэр, але паралельна на старую мэблю палюе айцец Фёдар, які спавядаў нябожчыцу-цешчу...

Рэпліка: «А можна так: раніцай крэслы, а вечарам грошы?»

Панядзелак, 23 красавіка

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.25** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.05 Зона Х. (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Напарніцы». (16+).
12.45, 13.05, 14.30, 15.25 Меладрама «Нявеста з Масквы». (12+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
21.00 Панарама.
21.50 Нашы. (6+).
22.10 Серыял «След». (16+).
23.45 Сфера інтарэсаў.
0.45 Дзень спорту.

Беларусь 2

7.00 Тэлераніца. (12+).
9.00, 18.35, 22.00 Тэлебарометр.
9.30, 20.00 Серыял «Зразумець. Дараваць». (16+).
10.30 Капейка ў капейку. (12+).
11.00 Камень, нажніцы, папера. (16+).
11.35, 22.10 «Спатканне з будучыняй». (16+).
12.35 «Свет навыварат». (16+).
13.40 М/с «Качыныя гісторыі». (0+).
15.00 Анімацыйны фільм «Універсітэт манстраў». (12+).
16.40 Драма «Шукальнік вады». (16+).
19.15 Суперлато.
20.55 «Паненка-сялянка». (16+).
22.05 КЕНО.
23.05 Ідзі сюды і танцуй.
23.10 Серыял «Найлепшы тыдзень майго жыцця». (16+).
0.05 Сыграй мяне, калі зможаш. (12+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
Мясцовая ўлада спадзяецца на падтрымку ў знішчэнні баршчэўніку на землях агульнага карыстання населеных пунктаў. Трэба, каб была прадугледжана сістэма адзіных падыходаў для ўсёй краіны. Яды, напрыклад, не заўсёды можна прымяняць, бо ў вёсцы жывуць людзі, утрымліваюцца жывёлы. Неабходна дастатковае фінансаванне для камбінаванага знішчэння, дадатковая рабочая сіла, абсталяванне...

Фактычна сёння сельсавет застаецца «адзін на адзін» у пытанні знішчэння баршчэўніку. Зможа зарабіць фінансавыя сродкі — праца будзе выканана якасна. А не зможа — прыйдзецца баршчэўнік касіць. Але эфект ад гэтага часовы.

Дадатковыя фінансы ў сельскім выканкаме зарабляюць дзякуючы правядзенню аўкцыёнаў па продажы зямлі. На гэтыя грошы закупаюць яды, а таксама аплачваюць працу «знішчальнікаў». Сродкі выкарыстоўваюцца для таго, каб у цэлым навесці парадак на зямлі. У прыватнасці, на могілках. Іх на тэрыторыі сельсавета 15, плюс добраўпарадкоўваюць яшчэ каля 30 — у вёсках суседніх сельсаветаў. Дарэчы, дрэвы не ўтылізуюць, а выкарыстоўваюць для ўласных патрэб: ацяплення, добраўпарадкавання...

Наогул, прадпрыемства па аказанні паслуг стараецца актыўна зарабляць. У прыватнасці, у крэдыт купілі лінію дрэваапрацоўкі. У ліку іншага вырабляюць пелеты, так званыя «еўрадровы» ў скрынках. А яшчэ не толькі ў Варонаўскім сельсавеце, але і іншых, косяць траву, зімой у Варонах чысцяць снег. Аказваюць насельніцтву транспартныя і іншыя паслугі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«АГРЭСАРУ»

Гэта і ўзворванне, і кропкавае выкопванне. Быў час, калі ў Расіі для знішчэння баршчэўніку выкарыстоўвалі нават... танкі. Такое было ў сярэдзіне 2000-х гадоў пад Санкт-Пецярбургам. Здавалася, што цяжкая бранятэхніка сваімі гусеніцамі здолее «прыдушыць» агрэсара... Тады спецыялісты давалі ацэнкі: для вынішчэння аднаго гектара баршчэўніку патрэбна 600—1000 еўра. У Латвіі, напрыклад, штогод на гэтыя мэты выдаткоўвалася каля 20 мільёнаў еўра, прычым, без асаблівага поспеху. У прылеглых да Беларусі абласцях Расійскай Федэрацыі штогод — па некалькі мільярдаў рублёў. Зараз, улічваючы шматгадовую практыку прымянення розных метадаў барацьбы з гэтай раслінай, самым эфектыўным лічыцца хімічны. Хоць бываюць сітуацыі, калі яго выкарыстоўваць нельга — на ахоўных тэрыторыях, у водаахоўных зонах, на тэрыторыі населеных пунктаў.

Што датычыцца жывёлы, дык яна, у адрозненне ад чалавека, абаронена ад апёкаў баршчэўніку. Аднак калі тыя ж каровы будуць ужываць расліну ў ежу, гэта прывядзе да пагаршэння якасці малака. У яго можа з'явіцца спецыфічны горкі смак. Па некаторых ранейшых даследаваннях навукоўцаў з краін Балтыі, уключэнне ў рацыён баршчэўніку прыводзіць да бясплоднасці рагуль. А вось на Захадзе распаўсюджана іншая эфектыўная мера як альтэрнатыва вышэйназваным спосабам барацьбы з раслінай — гэта выкарыстанне баршчэўніку для кармлення коз і авечак. Статак жывёл запускаецца на агароджаны ўчастак, дзе і знішчае навалу. Дарэчы, менавіта дзякуючы дзікім козам баршчэўнік Сасноўскага не атрымлівае такога распаўсюджвання на сваёй радзіме — Каўказе. Праўда, застаецца пытанне якасці прадукцыі ад тых коз і авечак...

У нашай краіне мэтанакіраваную і планавую барацьбу з баршчэўнікам пачалі са стварэння дзяржаўнага кадастру расліннага свету, калі з'явілася магчымасць дакладна і адназначна даведацца пра сітуацыю ў кожным раёне Беларусі. Такая работа дагэтуль нідзе не праводзілася, таму яна адразу стала прыкладам пераймання для Расіі, Украіны, Балгарыі, краін Балтыі.

> Быў час, калі ў Расіі для знішчэння баршчэўніку выкарыстоўвалі нават... танкі. Такое было ў сярэдзіне 2000-х гадоў пад Санкт-Пецярбургам.

У рамках стварэння кадастру праводзіўся суцэльны параённы ўлік. Калі ўбачылі ўсю сур'ёзнасць праблемы (на шчасце, у Беларусі не было значных ачагоў паражэння, як у навакольных краінах), па ініцыятыве Міністэрства прыродных рэсурсаў было прынята рашэнне аб рэалізацыі нацыянальнага плана барацьбы з баршчэўнікам Сасноўскага. Такім чынам услед за Расіяй, Украінай, Польшчай і іншымі краінамі гэтая праблема была ўзнята на дзяржаўны ўзровень.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«Дарожная карта» ў дапамогу

На Міншчыне з баршчэўнікам Сасноўскага будуць змагацца прафесіяналы

У Мінскай вобласці выяўлена 950 месцаў, дзе расце баршчэўнік Сасноўскага. Гэтая шкодная расліна займае больш як 364 гектары. Найбольшая яе колькасць — у Лагойскім раёне, на долю якога прыходзіцца амаль 32 % агульнай плошчы вырастання чужароднай расліны на тэрыторыі вобласці. У Мінскім, Слуцкім, Пухавіцкім, Уздзенскім, Барысаўскім, Нясвіжскім раёнах гэты паказчык меншы — ад 11,2 да 3,8 %, паведамілі ў Мінскім абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

У мінулым годзе мерапрыемствы па абмежаванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніка Сасноўскага ў цэнтральным рэгіёне праведзены на плошчы 363,7 гектара (гэта 99,7 % ад агульнай плошчы яго вырастання). Асноўныя прычыны, па якіх мерапрыемствы не выкананы цалкам, — нясвоечасовая работа землекарыстальнікаў па барацьбе з гэтай шкоднай раслінай, а таксама павелічэнне плошчы вырастання баршчэўніку на няўдобіцах і цяжка даступных для апрацоўкі месцах.

Сёлета Мінскім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя падрыхтаваны план дзеянняў па барацьбе з баршчэўнікам Сасноўскага — «дарожная карта» — у сталічнай вобласці. Дакумент зацверджаны першым намеснікам старшыні Мінаблвыканкама Ігарам Макарам.

У адпаведнасці з «дарожнай картай» у кожным раёне вобласці для карыстальнікаў, на землях якіх выяўлены зараснікі баршчэўніка, распрацаваны і даведзены канкрэтныя мерапрыемствы па абмежаванні яго распаўсюджвання і колькасці, а таксама аб'ёмы, метады і тэрміны выканання дадзеных работ.

У кожным раёне вызначана арганізацыя, якая выступае заказчыкам такіх мерапрыемстваў. Хімічную апрацоўку ўчасткаў будуць выконваць спецыялізаваныя арганізацыі, якія маюць адпаведны вопыт у гэтай справе. Выканаўцаў выберуць шляхам правядзення працэдуры закупкі паслуг. Зроблена гэта для таго, каб дабіцца ўстойлівых станоўчых вынікаў.

У Мінскай вобласці сёлета будуць выкарыстоўваць пераважна хімічны метад барацьбы з інвазійнай раслінай. З улікам практыкі прымянення разнастайных спосабаў барацьбы з баршчэўнікам гэты — самы эфектыўны. На выкананне ўсіх мерапрыемстваў па хімічнай апрацоўцы плошчаў рашэннем Мінскага абласнога Савета дэпутатаў прадугледжана 417 465 рублёў, або 100 % ад неабходнага.

У межах рэалізацыі «дарожнай карты» тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды будуць весці штотыднёвы кантроль за выкананнем спецыялізаванымі арганізацыямі мерапрыемстваў па барацьбе з баршчэўнікам.

За нясвоечасовае або неналежнае іх выкананне прыйдзецца заплаціць штраф у памеры да 20 базавых велічынь. Такую адказнасць прадугледжвае Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

МЯСЦОВЫ ЧАС

ЧУЖАЯ БЯДА — НЕ ЧУЖАЯ

СТАРШЫ ўчастковы Мазырскага РАУС Яўген СІГАЙ ужо 12 гадоў працуе на тэрыторыі Козенскага сельсавета. Тэрыторыя яго адказнасці падвоена грамадскай пасадай. Сёлета яго другі раз выбралі дэпутатам сельскага Савета, які знаходзіцца практычна адразу за мяжой Мазыра.

Дарэчы, у сельсавет уваходзіць дзевяць вёсак, на тэрыторыі якіх жыве амаль 13 тысяч жыхароў. Цяпер можаце ўявіць, што гэта адпавядае колькасці невялікага райцэнтра. Ёсць, канешне, і свае асаблівасці, гаворыць маёр міліцыі.

— Напрыклад, у вёсцы Нараўчызна цяпер вельмі бурна ідзе будоўля катэджаў. А значыць, асноўная праблема ў гэтым населеным пункце, дзе будуецца больш за 500 дамоў, — крадзяжы інструменту і будаўнічых матэрыялаў. Канешне, мы праводзім рэйдавыя мерапрыемствы сіламі Мазырскага РАУС. Зусім нядаўна злавілі злачынцу, які ўжо быў судзімы за крадзеж будаўнічага інструменту ў гэтай жа вёсцы, пасля вызваліўся і паўтарыў свой «подзвіг».

Асобных сваіх «герояў» Яўген Рыгоравіч не тое што ў твар ведае — можа біяграфіі з падрабязнасцямі пераказаць. Але ж і яго, участковага і дэпутата, таксама ведаюць усе і звяртаюцца часта непасрэдна, без заяў у міліцыю. Ды што там — прыходзяць нават дадому. Тым больш што сам ён жыве побач — у вёсцы Бабраняты.

— Часам па гаспадарцы чымсьці займаешся, а да цябе заходзяць з праблемамі людзі. Канешне, дапамагаю. Вось сёння дапамог аформіць жанчыне дакументы на лячэнне мужа ад алкагалізму. Афіцыйна гэта трэба было б зрабіць інакш: прыходзьце, пішыце заяву... А можна па-чалавечы ўсё больш хутка вырашыць.

На тэрыторыі Козенскага сельсавета многа шматпавярховых дамоў. Некаторыя з іх будаваліся з улікам будучага пражывання шматдзетных сем'яў. Ім дзяржава давала кватэры пад ільготныя крэдыты. Асноўная маса сем'яў, па словах Яўгена Сігая, — нармальныя, але ёсць і такія, хто патрабуе асаблівай увагі:

— Пры здзяйсненні правапарушэнняў у такіх сем'ях мы накіроўваем дакументы ў аддзел адукацыі на рэагаванне. Яны рэагуюць тэрмінова: каго на ўлік ставяць, каго папярэджваюць... Зусім нядаўна да мяне звярнулася маладая жанчына: маўляў, пакуль вы былі ў адпачынку, тут на мяне супрацоўнікі міліцыі два разы складалі пратакол за дробнае хуліганства — несправядліва! Плача, гаворыць, што «не такая». У яе двое дзяцей — адно ў школе, другое ў садку... Але ж праз два дні па яе адрасе — адразу тры выклікі на працягу дня. У тым ліку ад мужа. Высветлілася, зноў была ў стане алкагольнага ап'янення... Цяпер паставяць на ўлік як сацыяльна небяспечную.

А вось мазыранка Людміла паскардзілася, што з участка пад забудову дома знік старэнькі сабака Тузік, якога яна прывезла з Ляскавічаў пасля смерці сваёй маці. Жанчына штодзень яго наведвала, прыносіла паесці. Але ў снежні мінулага года дварняк знік — мяркуючы па ўсім, хтосьці проста перарэзаў ашыйнік. Жанчына беспаспяхова спрабавала



знайсці сабаку сама, а потым набрала «102».

Праз некаторы час жанчыне патэлефанаваў старшы ўчастковы інспектар міліцыі Яўген Сігай. Ён пры сустрэчы максімальна грунтоўна запісаў прыкметы зніклага сабакі. Міліцыянер паспеў перагаварыць з суседзямі па ўчастку, пабываць у прытулку для безгаспадарных жывёл, наведаў дзяржаўную і прыватную ветбальніцы. Далучыў да пошуку сабакі групы ў сацыяльных сетках... У лютым яму паведамілі, што сабаку, падобнага па прыкметах, бачылі ў мікрараёне каля смеццевых кантэйнераў.

Якім жа было шчасце Людмілы, калі высветлілася, што яе Тузік жывы, хоць і крыху траўмаваны — кульгаў на адну лапу. Шчаслівая гаспадыня знайшла месца для яго будкі побач са сваім домам. А ў знак удзячнасці напісала ліст на імя начальніка УУС Гомельскага аблвыканкама генерал-маёра міліцыі Уладзіміра Захарчука. У ім яна шчыра падзякавала супрацоўніку Мазырскага РАУС Яўгену Сігаю.

Яўген Рыгоравіч кажа, што пытанні ў людзей бываюць самыя розныя і некаторыя з іх не датычацца яго прафесійнай дзейнасці. Аднак дэпутацкі статус абавязвае, а чалавечыя стасункі — яшчэ больш:

— Нехта звяртаецца па юрыдычную кансультацыю. Нехта просіць: правядзіце з мужам гутарку. Звярталася жанчына з Бабранят — дапамажыце зрабіць дарогу. Я перадаў просьбу старшыні сельскага Савета, пасля чаго праехаў грэйдар — параўнялі дарогу. Цяпер разглядаецца пытанне, каб пракласці там асфальт. Быў зварот ад мужчыны, якога не задавальняла, што непасрэдна над яго кватэрай праходзіла сістэма ацяплення. Вырашылі і гэта пытанне. Калі да мяне звяртаюцца з нейкай праблемай і яна не адносіцца да маёй кампетэнцыі, — я перадаю інфармацыю ў сельсавет ці іду да старшыні мясцовай гаспадаркі. І разам вырашаем, што рабіць.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

АХОВА ПРАЦЫ

1500 парушэнняў

пры падрыхтоўцы да вясенне-палявых работ выявіла прафсаюзная тэхінспекцыя

Месячнік грамадскага кантролю за захаваннем заканадаўства аб ахове працы ў сельскагаспадарчых арганізацыях праходзіў з 15 сакавіка. Тэхнічныя інспектары працы Федэрацыі прафсаюзаў праверылі больш за 270 гаспадарак.

У цэлым наймальнікі пастараліся забяспечыць здаровыя і бяспечныя ўмовы для работнікаў. Але сітуацыя неідэальная.

— На асобных сельскагаспадарчых прадпрыемствах назіраецца недастатковая сур'ёзнае стаўленне да правілаў у сферы аховы працы. Так званы чалавечы фактар у многіх выпадках з'яўляецца асноўнай прычынай незахавання ўстаноўленых нормаў і вядзе да вытворчага траўматызму. У сувязі з гэтым мы прадоўжым маніторынг па ахове працы ў аграпрамысловым комплексе на працягу ўсёй пасяўной кампаніі, — пракаментаваў **галоўны тэхнічны інспектар працы ФПБ Аляксандр ЗАЙЦАЎ.**

Сярод асноўных парушэнняў — адсутнасць у работнікаў сродкаў індывідуальнай абароны і спецадзення, ігнараванне правілаў бяспекі пры абслугоўванні і рамонце тэхнікі. На некаторых прадпрыемствах не праводзіліся перад- і паслярэйсавыя медагляды, не функцыянавалі санітарна-бытавыя памяшканні. У шэрагу арганізацый не было інжынераў па ахове працы. Большасць парушэнняў, як правіла, ліквідуюцца наймальнікамі ў найкарацейшыя тэрміны, і для гэтага не патрабуецца вялікіх фінансавых выдаткаў.

У рамках маніторынгу вывучаецца таксама, ці забяспечваюцца работнікі на пасяўной гарачым харчаваннем, ці ёсць медыцынскія аптэчкі на месцах работы з пестыцыдамі і мінеральнымі ўгнаеннямі. Не дапускаюцца ў эксплуатацыю машыны і трактары, якія не адпавядаюць патрабаванням бяспекі або не прайшлі тэхагляд Дзяржтэхнагляду.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 22 мая 2018 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества, в рамках 232-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

№	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы	Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.)	Целевое использование имущества	Сумма задатка (руб.)	Характеристика имущества и иные сведения
Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений, тел.: +375 (17) 225-66-22, +375 (17) 225-22-25							
1	г. Минск, ул. Фрунзе, 9Б	17,7	2,0	71,29	Под размещение автотранспорта	7,10	Здание специализированного автомобильного транспорта. Год постройки – 1980. (1*)
	1 Материал стен – кирпич; фундамент – железобетонный; перегородка – кирпичная, полы – бетонные; вентиляция – естественная. Отсутствует: отопление, водоснабжение, канализация, электроэнергия. Примечание: после заключения договора аренды имущество необходимо застраховать*						

Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.

Аукцион состоится **22 мая 2018 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра Имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель. Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства. Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

Лицо, желающее принять участие в аукционе:

– уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 232 от 22.05.2018 по предмету аукциона №**), перечисляемый на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, государственное предприятие «МГЦН» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов;**

– подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

индивидуальный предприниматель:

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

физическое лицо – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

– заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 23 апреля 2018 г. по 16 мая 2018 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

Порядок определения победителя аукциона:

– торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

– аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 100 (сто) базовых величин на дату проведения аукциона.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

Важно! *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

Договоры аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Телефоны для справок: отдел аукционов: + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды**: + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия**: + 375 (17) 328 36 58. **Интернет: www.mgcn.by.**

ПА-НОВАМУ

ЯК ВЁСКА СТАНОВІЦЦА ГОРАДАМ

Хутка з карты краіны знікнуць чатыры населеныя пункты Жабінкаўскага раёна

ЯШЧЭ 7 мая 2014 года ўказам Прэзідэнта краіны Жабінцы нададзены статус горада-спадарожніка Брэста. Праз некаторы час пасля выдання згаданага ўказа быў зацверджаны генеральны план развіцця Жабінкі. І ўжо планам прадугледжвалася далучэнне да райцэнтра даволі значных плошчаў зямель, куды ўвайшлі чатыры населеныя пункты. Пройдзе зусім нямнога часу, і вёскі Здзітава, Курпічы, Сцяброва і Шчэглікі спыняць сваё існаванне. Тады 1235 чалавек, якія жывуць у названых вёсках, стануць гараджанамі.

Цяпер без старасты

Пакуль жа і жыхары, і вёскі знаходзяцца ў пераходным стане. Таму што адзін статус яны ўжо, можна сказаць, страцілі, а другі яшчэ канчаткова не набылі. Рашэнне аб скасаванні вёсак было прынята на сесіі Жабінкаўскага раённага Савета дэпутатаў 9 лістапада 2017 года. І гэта можна лічыць адпраўной датай. Але Нацыянальнае кадастравае агенцтва пакуль не ўнесла змены ў адзіны рэестр адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь. Такое рашэнне і адпаведны дакумент чакаецца літаральна днямі. Пасля гэтага навaспечаныя гараджане атрымаюць запрашэнне прыйсці ў пашпартныя сталы, каб зрабіць адзнаку аб новай рэгістрацыі.

...Са **старшынёй раённага Савета дэпутатаў Анатолем ШАЛТАНЮКОМ** мы праехалі па былых вёсках, паразмаўлялі з людзьмі. Многія гаварылі, што пакуль асаблівых перамен не адчулі. Яны і раней жылі не зусім у вёсках, а хутчэй — у прыгарадзе. На працу тутэйшыя жыхары ў асноўным ездзяць у гарады, Брэст таксама побач. А вёскі гэтыя ўжо даўно пакрысе станавіліся «спальнымі раёнамі».

Каля вясковых хат, дзе жывуць найбольш пенсіянеры, і цяпер ходзяць куры з пеўнямі, гаспадыні дастаюць са склепа бульбу ды перабіраюць для будучай пасадкі. Дамы больш позняй пабудовы нагадваюць гарадскія сядзібы з усімі выгодамі і акуратнымі газонамі.

Першым, каго сустрэлі на вуліцы ў Здзітаве, аказаўся былы стараста вёскі. **Аляксандр БАТУЛЯ** працуе ў Жабінцы. Ён расказаў, што пасля апошніх выбараў у мясцовыя Саветы страціў свой статус старасты. Але аднавяскоўцы па-ранейшаму да яго звяртаюцца з рознымі пытаннямі. Калі ж Аляксандр спрабуе тлумачыць ім, што цяпер форма самакіравання зменіцца, бо ўсе сталі гараджанамі, то некаторыя выказваюць нязгоду: «Хай сабе мы і ў горадзе, а ты тады будзь у нас старастам часткі горада». Дарэчы, і ў дзень выбараў многія пыталіся, чаму няма ў бюлетэнях дэпутатаў сельскага Савета. Члены камісіі зноў і зноў тлумачылі новаўвядзенні.

— Зараз у вёсцы мяняюць назвы вуліц, — расказвае Аляксандр Віталевіч. — І з вуліцамі, нібы ў той «Іроніі лёсу», здараюцца розныя канфузы. Вось наша, вясковая, раней была Здзітаўская, аказалася, і ў Жабінцы ёсць Здзітаўская. Нам прапанавалі памяняць назву, але мы не захацелі. Навошта нам тыя далёкія палкаводцы, імёны якіх прапаноўвалі ў якасці назвы? Мы рашылі пакінуць сваю назву, дадалі толькі прыстаўку «стара». Цяпер будзе Стараздзітаўская, і ўсе, здаецца, не супраць. Але ж падчас любых перамен блытаніна непазбежная. Думаю, праз паўгода-год арганізацыйныя пытанні вырашацца і ўсё ўтрасецца, — заключыў былы стараста.

Старыя славутасці і новыя камунікацыі

Вёска Здзітава знакамітая найперш сваёй Свята-Мікіцкай царквой. Гэта адзін з самых старых драўляных храмаў Беларусі, узведзены ў 1502 годзе. Вядома, пражыў за пяць стагоддзяў некалькі рэстаўрацый. Але здзітаўская царква на беразе Мухаўца лічыцца помнікам заходнепалескай архітэктуры і ахоўваецца дзяржавай. Мясціны, мала сказаць маляўнічыя, — яны прыгажэнныя. Продкі ведалі, дзе храм узводзіць. І побач, таксама блізка ад берага ракі, нядаўна выросла вуліца з новых забудоў. Кошт участкаў на аўкцыёне даходзіў да 20 тысяч долараў. Але знайшліся ахвотныя, купілі, некаторыя ўжо пабудавалі дамы, іншыя працягваюць работу па ўзвядзенні жылля.

У Жабінкаўскім сельскім Савеце расказалі, што адзін з новых гаспадароў, калі яму паведамілі, што хутка будзе мяняць рэгістрацыю на гарадскую, вельмі абураўся, бо яго марай было працаваць у горадзе, а жыць менавіта ў вёсцы, побач з прыродай. «Дык у вашым жыцці нічога не зменіцца, памяняецца толькі афіцыйны статус», — даводзілі ў сельвыканкаме.

Здзітава разрастаецца на вачах. Новыя шырокія вуліцы, такія як, напрыклад, Васільковая, забудоўваюцца сучаснымі прыгожымі дамамі. Яшчэ летась тут праклалі сеткі водаправода. Да гарадскога водазабеспячэння падключаны і Курпічы.

А вось у Шчэгліках яшчэ вядзецца пракладка інжынерных сетак водазабеспячэння. На вуліцы Сасновай працуе брыгада ПМК-19. Галоўны інжынер Уладзімір Кірылюк сказаў, што працаваць даводзіцца з дапамогай малой тэхнікі, бо траншэі хутка запаўняюцца вадой. Будаўнікі ўлічваюць рэльеф мясцовасці. А паколькі інжынерныя камунікацыі пракладваюцца ўздоўж алеі старых дрэў, трэба быць уважлівымі і акуратнымі, каб не пашкодзіць дрэвы. І зноў жа алея выглядае вельмі прыгожай, нагадвае дарогу да даўнішніх панскіх сядзіб. Згаданыя пейзажы будуць, несумненна, радаваць новых жыхароў, якія пад участак атрымліваюць 15—16 сотак зямлі.

Крама і гарадскі аўтобус

У Шчэгліках нядаўна пабудавалі павільён новай крамы райспажыўсаюза. Адкрылі гандлёвы пункт па просьбах насельніцтва. Але пакуль што гэты магазін стратны. Абсалютная большасць жыхароў новых дамоў працуе ў гарадах, ездзяць яны на працу сваім транспартам, там жа і купляюць прадукты. Крыху большую выручку мае крама ў выхадныя дні. Прадавец спадзяецца, што выручка стане большай, калі сем'і заселяцца ў новабудоўлі.

Па дарозе ў Курпічы мы сустрэлі гарадскі аўтобус, які ішоў з былой вёскі ў кірунку райцэнтра. Вось вам прыкмета ўрбанізацыі вёскі — цяпер сюды ходзіць гарадскі транспарт. Курпічы цікавыя тым, што ў свой час тут была ўзведзеная цэлая вуліца так званых прэзідэнцкіх дамоў. ААТ «Жабінкаўскае» пабудавала жыллё для сваіх работнікаў. Гэтая шарэнга светлых будынкаў віднеецца здалёк, з шашы. Яшчэ адну вуліцу забудавала «Сельгастэхніка». Тут яшчэ раней былі падведзены газ і водаправод. З часам з'явіцца і новыя вуліцы. Пенсіянер, былы жывёлавод Анатоль Воўк пра свой новы статус кажа з усмешкай: «Пажыў у вёсцы, пажыву і ў горадзе». Анатоль Канстанцінавіч лічыць, што для яго нічога кардынальна не зменіцца: «Можа, хіба, магазін новы пабудуюць». Пакуль жа ў гэтую вёску прыходзіць аўтакрама, бо стацыянарнай няма.

Будзе толькі лепш

— Як толькі з'явіцца інвестар, мы адразу выдзелім у Курпічах пляцоўку. Няхай будуюць краму, — сказаў карэспандэнту газеты **старшыня Жабінкаўскага райвыканкама Дзмітрый ГАРАДЗЕЦКІ.** — Са змяненнем статусу населеных пунктаў людзям дакладна горш не стане. Перад прыняццем рашэння мы праводзілі сходы, сустракаліся з вяскоўцамі, адказвалі на іх шматлікія пытанні. Работа, якая зараз вядзецца, скіравана на будучыню найперш абласнога цэнтра. Горад-спадарожнік будзе расці. Тая інфраструктура, якая зараз ствараецца за сродкі, прадугледжаныя праграмай развіцця, паслужыць былым вяскоўцам і новым гараджанам.

Літаральна за паўгода палепшылася транспартнае абслугоўванне жыхароў, дабавіліся аўтобусы, павялічана працягласць некаторых маршрутаў, — кажа кіраўнік раёна. — Напрыклад, у пасёлак цукровага завода аўтобус цяпер ходзіць праз вёску Сцяброва. У Шчэглікі будзе адкрыты гарадскі маршрут з 1 верасня. Працягваецца пракладка інжынерных сетак. Пасля пракладкі водаправода пачнецца рэалізацыя праекта па паляпшэнні дарог. Пракладзена оптыка-валаконная сувязь. Рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя на замену сетак электразабеспячэння ў вёсцы Сцяброва. На стадыі падрыхтоўкі праект новых ачышчальных збудаванняў. Уладкоўваюцца велапешаходныя дарожкі ў Сцяброве і іншых вёсках. Словам, робіцца шмат для паляпшэння якасці жыцця людзей.

Намеснік старшыні райвыканкама Максім АНТАНЮК удакладніў, што ўсе работы, звязаныя з перайменаваннем вуліц, з новымі дакументамі, будуць праведзеныя за кошт бюджэту. Для новых штампаў у пашпарце былыя вясковыя жыхары будуць запрашацца па графіку, каб не ствараць чэргаў і эканоміць час грамадзян. Усе домаўладальнікі атрымаюць паведамленні ад агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры пра змену адраса. А вось рабіць новыя тэхнічныя пашпарты на дом ці ўчастак ім не спатрэбіцца. Такая неабходнасць узнікне ў новага гаспадара, калі ён купіць дом альбо атрымае яго ў спадчыну ці ў дар.

Старшыня райсавета Анатоль Шалтанюк лічыць, што ў названых вёсках даўно сталі сяліцца патэнцыйныя гараджане. Яны набывалі ўчасткі, узводзілі не вясковыя па выглядзе дамы, на працу ездзілі адразу ў горад, вазілі дзяцей у гарадскія школы. На медыцынскім уліку усе гэтыя людзі стаялі ў раённай паліклініцы, для іх у медабслугоўванні фактычна нічога не мяняецца. Жабінкаўскі сельвыканкам пакуль выдае пэўныя даведкі, напрыклад аб складзе сям'і і іншыя. А вось акты грамадзянскага стану, напрыклад аб нараджэнні ці смерці, сведчыць ужо загс, шлюбы рэгіструюцца таксама ў горадзе. «Шкада, вядома, што ў гісторыю адыходзяць назвы вёсак. Але пастараемся ўвекавечыць іх хоць бы ў назвах вуліц», — заўважыў старшыня райсавета.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Жабінкаўскі раён.

Пракладка камунікацый у Шчэгліках.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, Восточный переулок, 17

Предмет аукциона

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инв. номер	Адрес
Лот № 1			
Здание корпуса 13 (здание административно-хозяйственное)	6321 кв. м	240/С-43392	Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Якубовского, 73В
Составные части и принадлежности	Подвал		
Сведения о земельном участке	Земельный участок с кадастровым номером 223650100001013472, общ. пл. 0,1801 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания корпуса 13. Ограничения (обременения): охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0653 га		
Склад-арочник отдела сбыта (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)	1098,7 кв. м	240/С-43389	Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Якубовского, 73Б
Сведения о земельном участке	Земельный участок с кадастровым номером 23650100001013471, общ. пл. 0,2344 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания склада-арочника		
Начальная цена с НДС 20 %	**463 296,00 белорусских рублей (снижена на 20 %)**		
Лот № 2			
Транспортная проходная (здание специализированное автомобильного транспорта)	491,6 кв. м	240/С-29588	Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, пер. Восточный 2-й, 15
Составные части и принадлежности	Двухэтажное каменное здание транспортной проходной		
Сведения о земельном участке	Земельный участок с кадастровым номером 223650100001014707, общ. пл. 0,2236 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания транспортной проходной		
Начальная цена с НДС 20 %	**34 560,00 белорусских рублей (снижена на 20 %)**		
Лот №3			
Здание гаража-зарядной (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) (гараж-зарядная))	695,7 кв. м	240/С-29589	Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, пер. Восточный 2-й, 17
Составные части и принадлежности	Двухэтажное каменное здание гаража-зарядной		
Сведения о земельном участке	Земельный участок с кадастровым номером 223650100001014706, общ. пл. 0,2358 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания гараж-зарядной		
Начальная цена с НДС 20 %	**160 433,70 белорусских рублей (снижена на 20 %)**		

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи — **15** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.03.2018

Дата и время проведения аукциона	**02.05.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**27.04.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО

КАБ ВЫЯВІЦЬ ЗВАЛКІ

Першы ў краіне рэгіянальны інфармацыйны цэнтр па пытаннях абыходжання са стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі і небяспечнымі хімічнымі рэчывамі з'явіцца ў Копысі, паведамілі ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Цэнтр ствараецца на базе мясцовага дзіцячага сада — сярэдняй школы і ўстановы па ахове прыроды «Экалагічная сфера» ў рамках рэалізацыі праекта Праграмы малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду пры падтрымцы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Праграмы развіцця ААН у Рэспубліцы Беларусь.

На базе цэнтра будуць ствараццa і праходзіць навучанне валанцёрскія групы (з ліку мясцовых жыхароў, у асноўным моладзі) для выяўлення несанкцыянаваных звалак і складоў з састарэлымі пестыцыдамі і хімікатамі, а таксама тарай, якая выкарыстоўвалася для іх захоўвання. Гэта дазволіць выканаць канчатковую інвентарызацыю месцаў назапашвання небяспечных хімічных рэчываў і прыняць аператыўныя меры для іх ліквідацыі, што палепшыць экалагічную сітуацыю ў рэгіёне і будзе спрыяць стварэнню ўстойлівай сістэмы абыходжання са стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі і небяспечнымі хімічнымі рэчывамі.

У межах праекта прадугледжваецца закупка тэхнікі для акультурвання і навядзення парадку на прылеглай тэрыторыі, рэкультывацыі зямель пасля ліквідацыі несанкцыянаваных звалак адходаў, а таксама закладка доследнага ўчастка для вырошчвання раслін у адпаведнасці з прынцыпамі арганічнага земляробства — без прымянення хімікатаў.

Навучэнцы Копыскай сярэдняй школы самі прапанавалі назву для Інфармацыйнага цэнтра і пад кіраўніцтвам прафесійных дызайнераў і графікаў распрацавалі яго лагатып. Улічваючы экалагічную інфармацыйную і асветніцкую накіраванасць, ён атрымаў назву «Зялёнае святло».

СМЕЦЦЕ Ў... ЗАКАЗНІКУ

У Крупскім раёне ліквідавалі парушэнне рэжыму ўтрымання заказніка «Сялява».

Мінскім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя пры правядзенні палявых мерапрыемстваў у Крупскім раёне на тэрыторыі рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Сялява» было выяўлена парушэнне рэжыму яго аховы і выкарыстання — тут размяшчаліся адходы.

Па факце парушэння заканадаўства да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута як службовая асоба Крупскага раённага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Жылцеплабуд», так і само прадпрыемства — на суму 6296,5 рубля.

На сённяшні дзень адходы з тэрыторыі заказніка прыбраны, выкананы работы па рэкультывацыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАЛЁКАЕ—БЛІЗКАЕ

ПАМІЖ РАЙЦЭНТРАМ І СТАЛІЦАЙ

РАСКІНУЛАСЯ гэтая вёсачка за сотню-другую метраў ад дарогі Узда — Гарбаты. Ды «раскінулася» — моцна сказана. У веснавы дзень відаць з дарогі крайнія дамы дзвюх вуліц, каля якіх толькі зрэдку жывога чалавека ўбачыш. І каля зеленаватага колеру сцен фермы руху амаль не відаць. А яшчэ з паўстагоддзя таму Ялоўка жыла зусім іншым жыццём...

Гістарычная даведка сведчыць пра тое, што мінулае вёскі нават у параўнанні з яе суседкамі па цяперашнім Дзешчанскім сельсавеце Уздзенскага раёна небагатае, налічвае ўсяго менш за два стагоддзі. Але адметнае гэта паселішча тым, што ў недалёкім лесе паблізу вёскі ў час паўстання 1863—1864 гадоў адбыўся бой паміж паплечнікамі К. Каліноўскага (атрад пад кіраўніцтвам П. Дыбоўскага) і царскім войскам, якое значна пераўзыходзіла іх па жывой сіле і ўзбраенні. У няроўным баі паўстанцы страцілі 12 сваіх таварышаў...

У пачатку XX стагоддзя ў Ялоўцы налічвалася 52 двары, жыло тут больш як 330 жыхароў.

— Калі я вярнуўся са сталіцы на сваю малую радзіму (а было гэта ў 1996 годзе), на вуліцы Цэнтральнай стаяла 60 жылых дамоў ды на Зарэчнай 22, — прыгадвае Канстанцін Панцялееў, староста вёскі. — І ў кожным як мінімум адзін чалавек жыў. А яшчэ крыху раней, помню, як выйдуць мужыкі на касавіцу — грамада! Пакінуў жа я Ялоўку пасля заканчэння васьмі класаў Цялякаўскай школы. Скончыў у Мінску вучылішча будаўнікоў, адслужыў у арміі, ад трэста «Будмеханізацыя» скалясіў па Беларусі і Прыбалтыцы дзясяткі, сотні будпляцовак...

Ды вясковыя карані часта нагадвалі пра сябе настальгічнымі ўспамінамі, а пасля вярнулі Канстанціна Канстанцінавіча ў Ялоўку. Дваццаць гадоў адпрацаваў лесніком, абараняючы знаёмыя з дзяцінства яловыя, лісцевыя лясы ад браканьераў ды дробных шкоднікаў. Кожнае дрэўца ў наваколлі, кожнага чалавека тутэйшага ведае. І яны яго ведаюць. Як старасту, як дэпутата сельскага Савета некалькіх папярэдніх скліканняў.

Цяпер у Ялоўцы ўсяго 25 жылых дамоў, у якіх зарэгістравана 30 чалавек. Улетку іх колькасць павялічваецца як мінімум удвая — за кошт дачнікаў, адпускнікоў, гарадскіх дзяцей і ўнукаў. Людзі больш сталага ўзросту прыгадваюць, што тут было раней.

...А раней, у першай палове мінулага стагоддзя, славілася на ўсё наваколле ялоўская кузня, у якой працаваў дзед Канстанціна Панцялеева — Мікалай Клімовіч. У 30-я гады пад націскам руху калектывізацыі перадаў яе каваль калгасу. Пасля вайны яе перанеслі ў іншы будынак, а ў 70-я гады яна спыніла сваё існаванне. Магчыма, таму, што не стала і стайні, у якой у лепшыя часы трымалі па 50 і больш коней. Умела спраўляўся з імі, пеставаў кожнага жарэбчыка, нібы ўласнага, Яўгеній Рубскі.

Была ў Ялоўцы і свая птушкаферма. Крыклівым курыным царствам кіравалі Соф'я Сянькевіч з сям'ёй. Жывёлагадоўлю прадстаўлялі таксама асобныя драўляныя будынкі цялятніка ды кароўніка. У розныя гады загадвалі фермай Зінаіда Андрыеўская (яна, апроч таго, была і даяркай, і брыгадзірам паляводчай брыгады) і Фаіна Семянчук. Добрыя паказчыкі забяспечваў даглядчык жывёлы Вячаслаў Луцэвіч, а механічныя працэсы абслугоўваў пры ферме трактарыст Канстанцін Ананіч. Звыш трыццаці гадоў адпрацавалі ў жывёлагадоўлі і сёння працягваюць даглядаць тут бычкоў сын колішняга конюха Яўгеній Рубскі з жонкай Ядвігай. Праўда, старыя драўляныя будынкі даўно знеслі, засталіся цагляныя, пазнейшай забудовы...

Прысядзібныя ўчасткі вяскоўцаў абслугоўваюць тры кані прыватнікаў (у тым ліку і жывёліна старасты), міні-трактар пенсіянера Віктара Махнача, ёсць некалькі мотаблокаў. Пад кіраўніцтвам старшыні Дзешчанскага сельвыканкама

> Цяпер у Ялоўцы ўсяго 25 жылых дамоў, у якіх зарэгістравана 30 чалавек. Улетку іх колькасць павялічваецца як мінімум удвая — за кошт дачнікаў, адпускнікоў, гарадскіх дзяцей і ўнукаў.

Фота Сяргея ШАРАЯ.

Староста Ялоўкі Канстанцін ПАНЦЯЛЕЕЎ добра ведае сучасныя патрэбы вёскі.

> У памяці сённяшніх жыхароў Ялоўкі дзякуючы ўспамінам іх дзядоў і прадзедаў засталіся згадкі пра тое, як калісьці ў час жніва зжатыя сярпамі, убраныя косамі, пазней — жняяркамі, снапы з жытам ды пшаніцай звозілі ў два вялікія драўляныя гумны-збожжатокі. Позняй восенню ды зімой абмалочвалі іх цапамі жанчыны...

Мела Ялоўка і сваю пачатковую школу. Пазней у гэтым будынку працаваў сельскі магазін. Цяпер жа аўталаўка тры разы на тыдзень наведвае гэты населены пункт, дастаўляе прадукты, тавары першай неабходнасці, але і любую заяўку на больш складаную тэхніку ці будматэрыялы выканае.

— Прыгожыя ў нас мясціны, — працягвае знаёмства з роднай вёскай Канстанцін Панцялееў. — Невыпадкова ж і гараджане аблюбавалі іх — вунь колькі дачных пасёлкаў, садаводчых таварыстваў паблізу з'явілася. У лясах шмат грыбоў. Адразу за вёскай выкапаны вадаёмы, аматары рыбнай лоўлі і цяпер цягаюць карасёў, карпаў. А летам якое раздолле!

Таццяны Віннік і пры непасрэдным удзеле старасты і вяскоўцаў рэгулярна наводзіцца парадак на вясковых могілках: убралі стары драўляны плот — яго месца заняла сучасная бетонная агароджа, спілавалі на тэрыторыі апошняга прытулку продкаў старыя сухія дрэвы. Час ад часу, па меры назапашвання смецця, запрагае Канстанцін Канстанцінавіч каня, збірае непатрэбшчыну ды адвозіць на міні-палігон у Гарбаты. Ахвотна адгукаюцца сённяшнія жыхары Ялоўкі і прыезджыя нашчадкі мясцовых на запрашэнні прыняць удзел у суботніках па навядзенні парадку.

...У халоднае не па-вясноваму неба ўздымаецца над комінам вясковай хаты слупок дыму. У адным з хлеўчукоў кукарэкнуў певень. Бразнула века калодзежнага зруба. З цялякаўскай дарогі зварочвае ў бок населенага пункта легкавы аўтамабіль... Жыццё ў Ялоўцы працягваецца. Няхай не такое ажыўленае, як у другой палове мінулага стагоддзя, ды ўсё ж перагортваюцца адна за адной старонкі календара размешчанай непадалёку ад сталіцы вёсачкі. Колькі іх яшчэ наперадзе, гэтых старонак?

Віктар САБАЛЕЎСКІ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 19 красавіка 2018 года.**